Голас Радзімы

№ 16 (2158)
19 красавіка 1990 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

Гімназія, ліцэй... Гэтыя словы, здавалася б, узятыя з нейкага іншага жыцця і іншай эпохі, раптам сталі нашымі. Адзіная, працоўная, політэхнічная, як яшчэ нядаўна называлі сярэднюю школу, паціху дзеліцца манапольнай уладай на педагагічнай ніве. Працяглы час у краіне адукацыйная справа ставілася так, што віталася нівеліроўка асобы, ураўнілаўка. Дзеці са звычайнымі здольнасцямі і асабліва таленавітыя, са значным інтэлектуальным патэнцыялам, займаліся па адных навучальных праграмах і падручніках. Да ўсіх педагогамі прымяняўся аднолькавы падыход. Але прыйшоў час, і згубнасць такога метаду стала відавочнай. Нашаму грамадству сёння, як ніколі, патрэбны высокаадукаваныя, кваліфікаваныя кадры. А сапраўдны інтэлект і культуру трэба выхоўваць, нават песціць. І, безумоўна, ствараць для гэтага адпаведныя матэрыяльна-арганізацыйныя ўмовы. Менавіта з такой мэтай і быў заснаваны пры Белдзяржуніверсітэце першы ў Мінску ліцэй — фактычна сярэдняя школа, але з вельмі сур'ёзным вывучэннем матэматыкі і фізікі. Праўда, спецыялізаваныя школы існавалі ў нас і дагэтуль, і ліцэй не быў бы ліцэем, калі б там адначасова вельмі сур'ёзна не ставіліся да паглыбленага вывучэння літаратуры, замежных моў, фізічнай культуры, танцаў, этыкі і эстэтыкі... І гэта лагічна, бо тут рыхтуюць не проста будучых фізікаў ці матэматыкаў. Тут выхоўваюць людзей высокай культуры, якія будуць несці яе далей.

НА ЗДЫМКАХ: сённяшнія ліцэісты; Наталля ДВОРЫНА — псіхолаг ліцэя; урок інфарматыкі для ліцэістаў праводзіцца ў лабараторыях Белдзяржуніверсітэта. На першым плане — Алена МІКУЛЬСКАЯ; урок танца вядзе Вольга ГУСІНЕЦ; фізікі і матэматыкі спаборнічаюць не толькі ў вучэбных аўдыторыях.

Фота С. КРЫЦКАГА.



У чым драматызм перажываемага моманту? Краіна як бы знаходзіцца на піку таго самага пераходу з аднаго стану ў другі, аб якім я гаварыў. У эканоміцы ў нас, можна сказаць, сапраўднае міжцарства. Ужо не працуе камандная сістэма, але яшчэ не ўступіла поўнасцю ў свае правы новая, заснаваная на выкарыстанні эканамічных рычагоў, стымуляванні зацікаўленасці людзей у выніках сваёй працы, раскрыцці ўсіх творчых магчымасцей чалавека. Тое ж і ў палітычнай сферы: партыя, у адпаведнасці з яе новай роляй палітычнага авангарда, ужо адмаўляецца і ў значнай меры адмовілася ад аператыўнага кіравання гаспадаркай, вырашэння ішных практычных пытанняў дзяржаўнага жыцця, а новыя Саветы яшчэ толькі становяцца на ногі, не асвоілі ў поўнай меры сваіх уладных функцый, не скамплектавалі кампетэнтны апарат.

Словам, з адной сістэмы выйшлі, а ў другую яшчэ не ўвайшлі. Па сутнасці такі ж пераходны стан існуе цяпер практычна ва ўсіх сферах грамадскай дзейнасці. Гэта датычыць і партыі, якая працягвае выконваць ролю галоўнага рухавіка перабудовачнага працэсу і ў той жа час сама павінна перабудоўвацца, прычым рашуча, інакш ёй пагражае небяспека быць адцісненай з авангардных пазіцый.

Самае важнае — цяпер у нас ёсць платформа, якая вызначае асноўныя параметры выбранага шляху, мэты і задачы перабудовы як грамадскага працэсу, ролю самой партыі ў сацыялістычным грамадстве, якое абнаўляецца. Вядома, платформа, як і праект новага Статута, вынесеныя на абмеркаванне камуністаў, усяго народа, сустракаюць неадназначныя адносіны. Выказваецца многа дапаўненняў, заўваг, абгрунтаванай крытыкі. Усё гэта будзе належным чынам і абагульнена, і ўлічана пры дапрацоўцы гэтых дакументаў, абмеркаванні іх ужо на самім партыйным з'ездзе.

Разам з тым мы сутыкнуліся са спробамі адвесці партыю з выбранага ёю шляху, з пагрозай расколу. З аднаго боку, утварылася кансерватыўная плынь, якая баіцца паглыблення перабудовачнага працэсу або нават прама кліча назад, да форм жыцця, якія склаліся яшчэ пры Сталіне і мала змяніліся ў мінулым дзесяцігоддзі. Такое вяртанне было б згубным, надоўга пазбавіла б краіну ўсякага шанцу на адраджэнне, асудзіла яе на гібенне. Я ўжо не гавару аб тым, што яно неміну-ча суправаджалася б абавязковымі атрыбутамі ранейшых парадкаў: рэпрэсіямі, несправядлівасцю, незлічонымі ахвярамі, кансервацыяй галечы.

Нам трэба бачыць, да чаго гэта можа прывесці, каб займаць цвёрдую грамадзянскую пазіцыю. Упэўнены, што наш народ, моладзь у першую чаргу рашуча адхіляць спробы вярнуць краіну ў мінулае, расстацца з набытай намі свабодай.

З другога боку, грамадству прапануюць адмовіцца ад сацыялістычных прынцыпаў, па сутнасці прызнаць памылковым увесь шлях, пройдзены пасля кастрычніка 1917 года. Гэта азначала б паставіць пад пагрозу тыя сацыяльныя заваёвы, якія з'яўляюцца важнай пазітыўнай часткай нашага гістарычнага вопыту, сысці з магістральнага шляху грамадскага развіцця. Бо многія сацыялістычныя ідэі і каштоўнасці ўжо сталі і ўсё больш становяцца нормай жыцця ўсяго чалавецтва на парозе XXI стагоддзя. І без нашага пазітыўнага вопыту сучасная цывілізацыя была б, як цяпер агульнапрызнана, зусім іншай.

Гэта азначала б таксама здрадзіць памяці старэйшых пакаленняў савецкіх людзей, якія ў найцяжэйшых умовах вялі барацьбу за індустрыялізацыю краіны, стварэнне сучаснай навукі і тэхнікі, вынеслі на сваіх плячах увесь цяжар вайны і перамаглі, прынёсшы свабоду народам Еўропы.

(З прамовы М. С. ГАРБАЧОВА на XXI з'ездзе ВЛКСМ 10 кастрычніка 1990 года).

ЧАЛАВЕК І ЯГО СПРАВА



Больш за 1 300 аперацый на рахунку артапеда-траўматолага Валерыя Разанскага—галоўнага ўрача Гомельскай абласной бальніцы. Майстэрства хірурга максімальна скарыстоўвае Валерый Іванавіч на карысць людзям. У ліку першых медыкаў працаваў ён і ў радыяцыйнай зоне адразу пасля чарнобыльскай трагедыі. І па сёння прымае самы актыўны ўдзел у розных формах аздараўлення пацярпеўшых ад аварыі на атамнай электрастанцыі.

НА ЗДЫМКУ: Валерый РАЗАНСКІ пасля паспяховай аперацыі.

ЗАЯВА ТАСС

ПРАЎДА ПРА КАТЫНЬ

На сустрэчах паміж прадстаўнікамі савецкага і польскага кіраўніцтва, у шырокіх колах грамадскасці доўгі час узнімаецца пытанне аб высвятленні абставін гібелі польскіх афіцэраў, інтэрніраваных у верасні 1939 года. Гісторыкамі дзвюх краін былі праведзены старанныя даследаванні катынскай трагедыі, уключаючы і пошук дакументаў.

У самы апошні час савецкімі архівістамі і гісторыкамі знойдзены некаторыя дакументы аб польскіх ваеннаслужачых, якія ўтрымліваліся ў Казельскім, Старабельскім, Асташкаўскім лагерах НКУС СССР. З іх вынікае, што ў красавіку—маі 1940 года з прыкладна 15 тысяч польскіх афіцэраў, якія ўтрымліваліся ў гэтых трох лагерах, 394 чалавекі былі пераведзены ў Гразавецкі лагер. Асноўная ж частка «перададзена ў распараджэнне» ўпраўленняў НКУС адпаведна па Смаленскай, Варашылаўградскай і Калінінскай абласцях і нідзе больш у статыстычных справаздачах НКУС не ўпамінаецца.

Выяўленыя архіўныя матэрыялы ў сваёй сукупнасці даюць магчымасць зрабіць вывад аб непасрэднай адказнасці за злачынствы у катынскім лесе Берыі, Мяркулава і іх памагатых.

Савецкі бок, выказваючы глыбокае шкадаванне ў сувязі з катынскай трагедыяй, заяўляе, што яна з'яўляецца адным з цяжкіх злачынстваў сталінізму.

Копіі знойдзеных дакументаў будуць перададзены польскаму боку. Пошук архіўных матэрыялаў працягваецца.

СТО ГАДОЎ

СЛУЖАЦЬ ЛЮДЗЯМ

Споўнілася сто гадоў сельскай бальніцы ў вёсцы Рыжкаўка Быхаўскага раёна. Бальніца была пабудавана па ініцыятыве і на сродкі графіні Аляксандры Талстой. Адна са старэйшых у Беларусі, гэта медыцынская ўстанова мае багатую гісторыю. Тут у розныя гады працавалі верныя інтарэсам гуманізму падзвіжнікі. У нялёгкіх умовах сельскай глыбінкі яны выратавалі тысячы жыццяў.

Бальніца, яе работнікі і зараз аддана служаць людзям. Праўда, юбілей ім давялося адзначаць не ў святочнай абстаноўцы. Сельская бальніца паранейшаму знаходзіцца ў будынку барачнага тыпу. І перспектывы пакуль не відаць.

ПАД АСОБЫМ КАНТРОЛЕМ

Якая якасць прадуктаў, што мы ўжываем! Гэтае пытанне штодзённа трывожыць многіх. А дакладны адказ на яго можна атрымаць на Мінскай санітарна- эпідэміялагічнай станцыі, дзе ёсць радыелагічная лабараторыя. Ужо праз тыдзень пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС яе супрацоўнікі штодзённа пачалі праводзіць замеры на забруджанне радыенуклідамі паветра, вады, прадуктаў харчавання. Пад асобым кантролем — прадукцыя хлеба- і малаказаводаў, мясакамбінатаў. Звяртаюцца ў лабараторыю таксама жыхары горада і розных раёнаў. Тут не адмовяцца праверыць «чысціню» мяса і малака з асабістага падвор'я, сабраных у лесе грыбоў.

НА ЗДЫМКАХ: мінчанін А. КАВАЛЕЎСКІ прывёз праверыць сельгаспрадукцыю са сваёй радзімы — вёскі Бакшты Іўеўскага раёна; работнікі радыелагічнай лабараторыі В. ПАНФІЛАВА (злева) і Ж. ЯНОЎСКАЯ штодзённа правяраюць прадукцыю на забруджанне радыенуклідамі.

ЮБІЛЕЙНЫЯ РАЗВАЖАННІ

ЧАЛАВЕК ПА ІМЕНІ ЛЕНІН

120-ю гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна мы сустракаем у спрэчках аб ім, аб яго ролі ў гісторыі нашай сацыялістычнай дзяржавы.

Як ні дзіўна, але, нягледзячы на ходкую фразу «аб самым чалавечным чалавеку», у асвячоным ідэалагічнай догмай вобразе Леніна менш за ўсё можна было знайсці рысы менавіта чалавечай уласцівасці. «Чалавеку ўласціва памыляцца»,—гаварылі рымляне. Менавіта гэтага і не ўмеў рабіць кананічны Ленін. Ён не проста не ўмеў памыляцца, ён не проста заўсёды меў рацыю—ён не быў здольны нават зведваць на сабе якія-небудзь уплывы збоку. Уплываў толькі ён. Ён быў Абсалютным суб'ектам, гэта значыць калі не богам, то богачалавекам як мінімум. Такая трактоўка вобраза Леніна не магла, вядома, вытрымаць абгрунтаванай навуковай крытыкі. Але і абарона гэтай трактоўкі вялася сродкамі, далёкімі ад навукі.

Але што цікава: вынікам першых крытычных выступленняў не стала «ачалавечванне» вобраза Леніна. Ленін як быў, так і застаўся Абсалютным суб'ектам. Толькі калі раней ён быў канчатковай прычынай перамог і дасягненняў савецкага грамадства, то цяпер ён стаў канчатковай прычынай з'яў негатыўных. Схема засталася такой жа «чорна-белай», як і была, якая не ўлічвае таго факта, што гісторыю робяць жывыя людзі, з іх вартасцямі і недахопамі, з іх праватой і памылкамі. А чалавек, як вядома,— гэта не толькі суб'ект, гэта і аб'ект гісторыі. І ў любым яго больш ці менш значным учынку праяўляюцца не толькі сіла яго розуму і волі, але і сіла той ці іншай тэндэнцыі грамадскага быцця. Гэта азбучная ісціна марксізму. Але чамусьці да аналізу фігуры Леніна яна прымянялася і прымяняецца вельмі рэдка. А хіба гэта не пытанне пытанняў: якія ж тэндэнцыі гістарычнага жыцця стаялі за спосабам думкі і дзеянняў правадыра рускай рэвалюцыі?

Ні для абаронцаў, ні для крытыкаў Леніна не з'яўляецца сакрэтам, што ў сваім прынцыповым светапоглядзе Ленін быў фігурай надзвычай цэльнай. Стаўшы аднойчы на пункт гледжання вучэння Маркса, ён з таго часу ішоў па выбранаму шляху, не прызнаючы нават магчымасці таго, што гэты шлях можа аказацца не адзіна правільным. Усю стракатую карціну грамадскага жыцця Ленін дзяліў на дзве дыяметральна супрацьлеглыя часткі: тое, што садзейнічае руху па адзіна правільнаму шляху, і тое, што такому руху процідзейнічае.

Непрымірымасць, нават нецярпімасць у адносінах да ўсяго, што адводзіць убок ад адзіна правільнага шляху,—гэта тое, што вылучаюць у светапоглядзе Леніна і абаронцы, і крытыкі. Але ці толькі асабістая ўласцівасць характару стаіць за гэтай рысай? Ці няма ў ёй такога, што характарызуе эпоху ў цэлым? Хіба філасофія адзіна правільнага шляху—гэта рыса толькі ленінскага светапогляду? І хіба прадстаўнікі іншых плыняў не верылі ў існаванне універсальнага ключа, з дапамогай якога можна было б вырашыць усе праблемы, што стаяць перад грамадствам? І хіба прадстаўнікі іншых плыняў не сцвярджалі, што гэты ключ знаходзіцца менавіта ў іх руках? І хіба цяпер мы не працягваем шукаць такі ж ключ, які дапамог бы нам пазбавіцца ад набалелых праблем?

Відаць, чалавецтва не дарэмна прайшло праз дзве сусветныя вайны і аказалася на грані ядзернай і экалагічнай катастрофы, каб усвядоміць, што эпосе «адзіна правільных шляхоў» павінна прыйсці на змену эпоха дыялога, эпоха кансенсусу і кампрамісу. Ісціна адна, але шляхі да яе могуць быць рознымі, і калі мы, ідучы па аднаму шляху, будзем бачыць, куды вядуць іншыя, хіба нам не стане больш ясна, дзе яна—ісціна? Але, паўтараем, для таго каб зразумець гэта, трэба было прайсці цераз насычанае палітычнымі катаклізмамі дваццатае стагоддзе. А аб якім дыялогу магла ісці размова ў самым пачатку гэтага стагоддзя, калі кожная плынь ужо ведала адказы і менавіта пад іх спрабавала падстроіць пытанні, а не наадварот? Калі класы, што «загадвалі» існуючым грамадскім парадкам, на кожным кроку нараджалі сваёй палітыкай сваіх «магільшчыкаў». Калі маючыя ўладу, нават ідучы на ўступкі сваім апанентам, тым не менш, рабілі ўсё магчымае, каб пакінуць недатыкальнымі самі асновы статус-кво, які значна падгніў. Калі пайсці на прынцыповы дыялог з грамадскімі сіламі, якія супрацьстаяць, азначала для кіруючага класа перастаць быць тым, чым ён з'яўляўся.

Сёння для палітычнага мыслення стала аксіёмай, што грамадскае жыццё на кожным кроку параджае супярэчнасці, і каб вырашаць іх, неабходна супрацоўніцтва ўсіх сацыяльных сіл. Любы рух наперад у жыцці грамадства—гэта вынік перш за ўсё пагаднення, кампрамісу паміж разнароднымі сіламі, а не іх барацьбы не на жыццё, а на смерць. Што здараецца ў выніку знішчэння адной з процілегласцей у працэсе барацьбы, савецкія людзі ведаюць са свайго горкага гістарычнага вопыту. І сённяшні стан сусветнай цывілізацыі, які няхай не ва ўсім нас задавальняе, але ўсё-такі дае веру ў існаванне гістарычнага прагрэсу, — гэта таксама вынік менавіта ўзаемадзеяння самых розных сіл і плыняў. Адной з найбольш уплывовых плыняў на працягу ўсяго XX стагоддзя быў камуністычны рух з Леніным на чале. З чалавекам па імені Ленін. З чалавекам, які падзяляў надзеі і ілюзіі свайго часу і свайго руху і ў дзейнасці якога, з усімі яго памылкамі і недахопамі, прарывалася вонкі тое самае патрабаванне лепшага жыцця, без якога немагчымы ніякі ўвогуле рух наперад.

Юрый КАРГУНЮК.

ПОМНІК ВОІНАМ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАМ

У Мінску адбылася закладка каменя-помніка ў памяць беларускіх хлопцаў, што служылі ў Афганістане, прымалі ўдзел у баях і загінулі там. На месцы, дзе цяпер ляжыць памятны камень, праз нейкі час будзе стаяць помнік салдатам, якія да канца выканалі свой воінскі абавязак.

На закладцы каменя прысутнічалі былыя воіны-«афганцы», маці загінуўшых хлопцаў. Менавіта меркаванне гэтых няшчасных жанчын улічвалася пры выбары месца для помніка: ён будзе пабудаваны ў старым горадзе — Траецкім прадмесці.

НА ЗДЫМКАХ: ідзе закладка памятнага каменя, прысвечанага загінуўшым воінам-«афганцам».

Фота М. МІНКОВІЧА.

СУСТРЭЧА З НЕЗВЫЧАЙНЫМ СУБЯСЕДНІКАМ

«АЙЦЕЦ ДЗМІТРЫЙ» У САЛДАЦКІМ СТРАІ...

У ваенным білеце гвардыі сяржанта Д. ЯРАСЛАЎСКАГА ў графе «грамадзянская спецыяльнасць» ёсць два запісы: радыётэлемеханік і крыху ніжэй — служыцель культу. Першую спецыяльнасць ён набыў, закончыўшы школу ДТСААФ. Другая, як сам тлумачыць, «дадзена богам». На наступнай старонцы — яшчэ два запісы: аб уручэнні знакаў «Гвардыя» і «Выдатнік Савецкай Арміі». Дзмітрыю дзевятнаццаць гадоў. У яго службовай картцы — толькі заахвочванні. Паўтара года ён служыць у рамонтнай роце. Воінская прафесія — санінструктар. Да арміі ж быў прыгадыяканам Міхала-Архангельскай царквы ў Грозным. І далей сваё жыццё вырашыў прысвяціць служэнню богу: будзе паступаць у духоўную семінарыю.

— На некаторых людзей словы «служыцель культу» дзейнічаюць вельмі адмоўна,— гаворыць Дзмітрый.— Яны асацыіруюцца ў іх свядомасці з нейкімі грамадска - небяспечнымі элементамі. Помню рэакцыю камандзіра вучэбнай роты, дзе я пачынаў службу. На мяне ён глядзеў з недаўменнем і трывогай. Звяртаўся да вышэйшага начальства з патрабаваннем забраць «папа» з роты, таму што ў яго, бачыце, баявая задача, а з такімі, як я... Зрэшты, гэта натуральная рэакцыя. Чаго можна чакаць ад тых, хто выхаваны ў атмасферы нецярпімасці да веруючых?

— А як ставяцца да вас таварышы па службе?

— Нармальна. Спачатку пасмейваліся, жартавалі. Але я іх не асуджаю. Яны выхаваны на адным-адзіным пастулаце атэізму: «Бога нама!» Гэтым і вычэрпваецца іх узровень кампетэнтнасці ў спрэчках навукі і рэлігіі.

Разам з тым я не імкнуся пераканаць іх у адваротным. Але не стамляюся паўтараць, што царства божае ўнутры кожнага з нас. Трэба прыслухоўвацца да сваёй душы. У ёй жыве добрае і вечнае.

Мы агрубелі і ачарсцвелі ў мірской мітусні. У нашых душах накапілася зло і раздражненне, якія ў любы момант гатовы выплюхнуцца на бліжняга. Нельга гэтага рабіць! Інакш пасеем яшчэ большую смуту і недавер'е адзін да аднаго.

У палку мяне завуць «айцец Дзмітрый». Я стаўлюся да гэтага нармальна. Тым больш, што бачу: да мяне цягнуцца, асабліва ў тыя мінуты, калі цяжка, калі трэба вярнуць душэўную раўнавагу. І я рады, што да майго слова прыслухоўваюцца, мне вераць. Ведаеце, у маёй прысутнасці хлопцы нават не лаюцца. А ў воінскіх жа калектывах працвітае мацяршчына — найпершая прыкмета бескультур'я.

— Скажыце, а вам ніхто не парушкаджае ў вашым веравызнанні?

— Усякае бывала. У вучэбным падраздзяленні мяне доўгі час не рашаліся адпускаць у царкву. Нават слухаць ніхто не хацеў. Тады я пайшоў на крайнюю меру: аб'явіў галадоўку. Дапамагло пасля першага ж снядання. У царкву тады мяне адпусцілі разам з... замполітам роты. Найдабрэйшай душы чалавек, я яго з удзячнасцю буду помніць усё жыццё, ён разумеў недарэчнасць сітуацыі, у якую трапіў па загаду начальства, яго мучыла сумленне, але зрабіць нічога не мог. Прастаяў непадалёку ад храма божага некалькі гадзін, чакаючы мяне.

Аднойчы ў мяне забралі падшыўку часопісаў Маскоўскай патрыярхіі. Нехта ўгледзеў у гэтым пагрозу маральным устоям камсамольцаў - атэістаў. «Крамольныя» часопісы пошстай адправілі дадому.

Трывожыць тое, што па інерцыі мінулых гадоў некаторыя на мяне глядзяць насцярожана. Служыў у медпункце палка — перавялі ў рамонтную роту. Ад людзей далей, каб «прапаганду» не разводзіў: у медпункце магчымасць для сустрэч куды шырэйшая, чым у роце. Рыхтаваўся ехаць у камандзіроўку — ветліва адмовілі: тут, маўляў, ты больш патрэбны. Такі кранальны клопат. А я хачу быць, як усе!

У мотастралковым палку праблем з выкананнем рэлігійных абрадаў у мяне няма. Вольна хаджу ў царкву, сустракаюся з веруючымі. Праўда, здараюцца іншы раз казусы.

— Напрыклад?

Неяк перад рэлігійным святам мяне адпусцілі ў звальненне разам з веруючым радавым Яцковым. На дваіх выдалі адну запіску аб звальненні. За варотамі кантрольна-прапускога пункта я раптам даведваюся, што мой спадарожнік — евангельскі хрысціянін-баптыст. Яму трэба спяшацца ў малітвены дом, мне — у царкву. Размешчаны яны ў розных канцах горада. Некаму сітуацыя можа здацца камічнай, але нам, паверце, тады было не да смеху. Гэтай паперкай мы аказаліся моцна прывязанымі адзін да аднаго.

«Вось што, брат мой,— сказаў тады я яму,— вядзі мяне ў малітвены дом, іншага выйсця ў нас няма». Грэх, вядома, мне, праваслаўнаму хрысціяніну, замест царквы аказацца ў дзень свята ў малітвеным доме. Але яшчэ большы грэх — парушыць воінскі парадак, які ў даны момант для нас увасабляла запіска аб звальненні. Вось так я правёў дзень сярод сектантаў.

— І ўсё ж такі ў армейскіх умовах цяжка выконваць рэлігійныя абрады...

— Па шчырасці кажучы, так, вельмі няпроста. Салдацкая служба звязана з непазбежнымі цяжкасцямі і нягодамі. Я гэта разумею і не бачу трагедыі, скажам, у тым, што ў час вучэння мне не выпадае наведаць царкву.

Летась перад веснавым пастом (а гэта сем тыдняў) я адправіўся на прыём да мітрапаліта Мінскага і Гродзенскага, экзарха ўсяе Беларусі Філарэта. Папрасіў у яго прэасвяшчэнства парады, як мне, салдату, прытрымліваецца паста. Ежу гатуюць для ўсіх жа аднолькавую, у салдацкай сталовай. Выслухаўшы мяне, уладыка сказаў: «Ты воін, сын мой, абаронца Айчыны. Харчуйся разам з усімі. Але не шчыруй». Такім чынам і вырашылася ўвогуле няпростая для мяне праблема.

— Вы ўжо працяглы час на Беларусі. Ці падабаецца вам тут?

— Вельмі! Добрыя, зычлівыя людзі, прыгожая зямля... Ведаеце, за паўтара года я прывык да рэспублікі, дзе мне выпала служыць, палюбіў яе. І хацеў бы застацца тут пасля службы назаўсёды. Між іншым, сказаў пра гэта і яго прэасвяшчэнству мітрапаліту Філарэту. Я думаю, ён зразумеў мой душэўны парыў, паабяцаў рэкамендаваць на вучобу ў духоўную семінарыю.

— Але вернемся да вашага вайсковага жыцця. Як наогул ідзе служба?

— Сапраўдная вера службе ніколі не перашкаджае. Гасподзь паслаў мне выпрабаванні ў выглядзе службы ў арміі, якую я павінен прайсці з крыжам у душы, ахоўваючы мір на зямлі. Што тычыцца цяжкасцей і нягод, то яны загартоўваюць цела і ўмацоўваюць душу.

Мой духоўны пастыр, айцец Пётр, гаварыў мне перад прызывам: «Царква заўсёды благаслаўляла веруючых на абарону Айчыны, таму што глядзіць на гэта як на святы абавязак».

Дарэчы, я мог і не служыць у арміі. Тры месяцы перад прызывам правёў сярод манахаў Троіцка-Сергіевай лаўры. Думаў цалкам прысвяціць сябе служэнню богу, адмовіцца ад усяго людскога.

— І ўсё-такі не пастрыгліся ў манахі. Чаму?

— Прычын некалькі. Галоўнае — мару, каб у мяне быў наследнік, які б прадоўжыў у будучыні маю справу. Не паверыце — і аб службе ў арміі думаў. Гэта сапраўды мужчынская справа. Я не хацеў бы, каб потым мае прыхаджане бачылі ўва мне чалавека, які не зведаў на сабе тое, што зведалі яны.

— Дзмітрый, а ці здараліся ў вас за паўтара года непрыемнасці ў салдацкай службе?

— Гавораць, што ад спагнанняў не застрахаваны ніводны, нават самы сумленны салдат. Ахвотна веру гэтаму. Служба цяжкая, памыліцца кожны можа. Але да мяне бог літасцівы — ні разу не быў пакараны камандзірамі.

А непрыемнасці... Аднойчы трапіў у такую гісторыю. Вяртаўся ў полк з кароткатэрміновага адпачынку. Затрымаўся на сем сутак па прычыне надта сур'ёзнай: вянчаўся са сваёй абранніцай. Пад вянец, дарэчы, пайшоў у ваеннай форме. У часць перад гэтым адправіў тэлеграму. Камандзір дазволіў прадоўжыць водпуск...

У Кіеве на вакзале мяне затрымаў патруль. Дакументы мае аказаліся не так афармленымі, як прынята. Паказаў даведку аб вянчанні, выдадзеную настаяцелем царквы. Мяне прынялі за дзівака — хто сёння вянчаецца ў царкве, у кожным раёне ж ёсць ЗАГС. Затрымалі, вядома. Не ведаю, колькі часу давялося б мне правесці на гарнізоннай гаўптвахце, калі б не дабіўся прыёму ў каменданта, а затым у начальніка гарнізона. Яны мне паверылі. Прыемная наша гутарка ішла больш за дзве гадзіны ў поўным узаемаразуменні. Развітваючыся, я падарыў ім па іконе і пажадаў, каб у іх сэрцах ніколі не знікала вера, надзея і любоў да падначаленых.

— Хто ваша «матушка», калі не сакрэт?

— Яе завуць Ірына, ёй васемнаццаць гадоў. Як і я, яна чалавек глыбока рэлігійны. Пазнаёміліся мы тры гады назад, абодва спявалі ў царкоўным хоры. У яе цудоўны голас — сапрана. Будзе паступаць у рэгенцкі клас духоўнага вучылішча.

— Дзмітрый, вы сказалі, што спявалі ў царкоўным хоры. А сучасныя рытмы — як вы да іх ставіцеся?

— У школе я хадзіў на дыскатэкі. Сам нават некалі пісаў свецкія вершы і музыку. А вось сучасныя танцы не прымаю. Іграю на баяне. Летась быў піянерважатым у лагеры, дзе адпачывалі дзеці нашых камандзіраў. Догмы, як бачыце, разбураюцца — ніхто з іх не пабаяўся, што я ўнясу сумятню ў слабыя юныя душы.

Гутарку вёў Васілій ЗДАНЮК.

ІДЭІ ВАШЫ— ГРОШЫ НАШЫ

Гэты банк неабходны ўсім, у каго ёсць «шалёныя» ідэі, але няма сродкаў іх увасобіць. Маецца на ўвазе беларускі інавацыйны банк, які з'явіўся зусім нядаўна. Чаму ўзнікла неабходнасць стварэння новай фінансавай установы?

Асноўная прычына — з'яўленне новых прадпрыемстваў, арганізацый, кааператываў, якія вылучаюць смелыя навукова-тэхнічныя ідэі і маюць патрэбу ў падтрымцы. Задача банка — крэдытаванне, фінансаванне і пасрэдніцтва ў галіне навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Інавацыйны банк камерцыйны, уваходзіць у адзіную банкаўскую сістэму краіны. Стараўся на паявой аснове. Заснавальнікамі сталі 44 прадпрыемствы і арганізацыі рэспублікі. Сярод іх — буйнейшыя аб'яднанні «Белаўтамаз», «Атлант», «Гарызонт», трактарны завод, Мінлегпром, Міндарбуд, Мінтранспарт, шэраг вышэйшых навучальных устаноў.

Зарэгістраваны ён год назад і пачаў з трох мільёнаў рублёў. На пачатак гэтага года на балансе ў банку ўжо было 65 мільёнаў. Супрацоўнічае ён з дзяржаўнымі прадпрыемствамі, кааператывамі, прыватнымі асобамі.

Так, сумесна з Навасельненскім раённым аграпрамысловым аб'яднаннем стварае вытворчасць агрэгатаў па ўнясенню тукапестыцыдаў. Іх укараненне дазволіць знізіць расход угнаенняў, зменшыць забруджанне прадукцыі нітратамі, павысіць ураджайнасць. На Гомельскім шклозаводзе дапамагае наладзіць выпуск аўтамабільнага шкла. Фінансуе работу аднаго з інстытутаў Сібірскага аддзялення АН СССР па стварэнню новых метадаў ачысткі газавых выкідаў і г. д.

Удзельнічае інавацыйны банк і ў стварэнні новых прадпрыемстваў і арганізацый. Ён прадаставіў фінансавыя рэсурсы ў арганізацыю лабараторыі вынаходніцкіх машын. Стварае таксама малыя прадпрыемствы, цераз якія лягчэй ідзе працэс укаранення перадавой тэхналогіі.

Банк падтрымаў ініцыятыву беларускага творчага цэнтра савецка-амерыканскай праграмы «Дзеці — творцы XXI стагоддзя», які вядзе збор сродкаў на будаўніцтва Рэспубліканскага дзіцячага гематалагічнага цэнтра. Ён выдзеліў ім крэдыт 300 тысяч рублёў.

45-ГОДДЗЕ ПЕРАМОГІ

Толькі згоніць вясёлае веснавое сонейка талы снег, віцябчанін Уладзімір Масюцін адкладвае хатнія клопаты і спяшаецца прывесці ў парадак сціплы абеліск ля дарогі, непадалёку ад дома, устаноўлены ў памяць невядомага савецкага салдата, загінуўшага пры абароне Віцебска. Ужо многія гады ветэран Вялікай Айчыннай даглядае гэты сціплы ўзгорачак з помнікам і агароджай, аберагае яго ад забыцця, не дае ў крыўду.

«Упарты стары», гаварылі пра яго дарожнікі, калі Уладзімір Паўлавіч не дазволіў ім знесці абеліск «у сувязі з вытворчай неабходнасцю».

— Ёсць рэчы больш неабходныя чалавеку, чым прамы адрэзак дарогі, — справядліва лічыць былы салдат-артылерыст. Права на такое сцвярджэнне, на асаблівыя адносіны да гісторыі краіны, да яе неацэнных рэліквій Уладзімір Масюцін заслужыў ўсім сваім жыццём.

...Ад Сталінграда да Берліна, амаль сем тысяч доўгіх кіламетраў жорсткай вайны прайшоў артылерыст Масюцін са сваёй 76-міліметровай гарматай, знішчаючы ворага, страчваючы таварышаў, набліжаючы Вялікую Перамогу. Цераз Днепр і Сож, Віслу і Одэр, па нямецкіх балотах і польскіх палях ішоў баявы разлік, у якім за вайну змагалася каля двухсот чалавек. І толькі двое дайшлі да Берліна: камандзір гарматы Гаўрыіл Гусеў і наводчык Масюцін. Сёння «масюцінскі» ЗІС-3 № 4940 можа ўбачыць кожны, хто наведае Цэнтральны музей Узброеных Сіл СССР. Зрэдку наведваецца сюды і сам ветэран, пры поўным парадзе, з ордэнамі Славы III ступені, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, шматлікімі медалямі. Прысядзе на лафет, не апасаючыся свісту варожых снарадаў, успомніць баявых сяброў.

Суровыя гады вайны — усяго толькі

часцінка багатай біяграфіі ветэрана. У мірны час Уладзімір Паўлавіч выбраў прафесію будаўніка. Спачатку вучыў гэтаму ж хлапчукоў, а затым па ўласнаму жаданню пайшоў на будоўлю, дзе і працаваў да пенсіі брыгадзірам комплекснай брыгады. І ў мірным жыцці ён не шукаў лёгкіх дарог, стараўся дабудаваць, дамарыць за тых, хто не вярнуўся.

...Побач з абеліскам пасадзіў салдат Масюцін дрэва. Па вясне яно ўспыхвае кветкамі, нібы салютуе. Няхай помніць свет выратаваны...

К. СЕВЯРЫНЕЦ.

НА ЗДЫМКАХ: ля абеліска з унучкай Волечкай; гвардыі сяржант Уладзімір МАСЮЦІН. 1944 год; сустрэча Уладзіміра МАСЮЦІНА з аднапалчанінам, былым артылерыйскім майстрам Фёдарам КУЗНЯЦОВЫМ.

Фота А. ЦАРЛЮКЕВІЧА.

МУЗЕЙ У ГАЙНАЎЦЫ: ХВАЛЯВАННІ І НАДЗЕІ

АПТЫМІЗМ — У ДАПАМОЗЕ ЎСІХ БЕЛАРУСАЎ

Пашырэнне братэрскіх сувязей з сябрамі-беларусамі Беласточчыны — пазітыў і заваёва перабудовы. Таму з вялікай цікавасцю мы сустракаем кожную вестку ад іх. На гэты раз прынёс яе ў таварыства «Радзіма» старшыня грамадскага Камітэта па будаўніцтву Беларускага музея ў Гайнаўцы Канстанцін МАЙСЕНЯ.

— Ад старшыні найперш за ўсё хацелася б даведацца, як ідзе будаўніцтва музея. Можа ўжо рыхтуецеся да ўваходзінаў!

— Так яно і ёсць у нейкім сэнсе. Але справа выглядае даволі складана. Канчаецца фінансавае забеспячэнне, засталося семсот долараў на рахунку. А гэта значыць, што мы не здольны даць будаўнічаму прадпрыемству фронт работ і вымушаны весці будаўніцтва гаспадарчым спосабам. А калі збяромся з сіламі, зноўку падпішам пагадненне з будаўнікамі.

Агульная карціна сёння такая: мы пабудавалі частку «А» музейнага комплексу. У «Б» выконваецца ўнутраная апрацоўка. Частку «Ц» будзем узводзіць па меры таго, як пойдзе накапленне дадатковай колькасці грошай.

Такім чынам, плануецца давесці да завяршэння будаўніцтва музея перад канцом гэтага года. Ужо праз пару месяцаў у частцы «А» адкрыецца міні-музей, якому будзе папярэднічаць выстаўка твораў беларускіх мастакоў. Яе мы ладзім сумесна з Беларускім фондам культуры, Міністэрствам культуры і шэрагам іншых арганізацый БССР.

— Вы сказалі, што не стае грошай... Наколькі я дасведчаны, пры пачатку будаўніцтва — а было гэта яшчэ перад прыходам да ўлады «Салідарнасці» — існавала дамоўленасць, што дзяржава будзе перыядычна асігноўваць на патрэбы грамадскага камітэта адпаведныя сумы...

— Сапраўды, тады ваявода абяцаў, што 70 працэнтаў кошту будаўніцтва нам выплацяць з дзяржаўнага бюджэту, а 30 мы возьмем з ахвяраванняў грамадскасці. Атрымалася наадварот. Нават больш таго, лічаныя разы сённяшнія ўлады падтрымалі нас фінансава. Безумоўна, асноўныя прычыны трэба шукаць у крызісным эканамічным становішчы краіны. Заробак у нас польскі, а цэны — заходнія. Адзін стальны ліст каштуе 8 мільёнаў злотых. А ўся пабудова абыдзецца больш як 1 мільярд злотых.

— Дык на чым грунтуецца ваш аптымізм?

— Маем моцную надзею, што польскія мясцовыя органы звернуць на нас увагу і знойдуць тыя рычагі, што палепшаць стан рэчаў. Урэшце, нельга сказаць, што ўлады наогул адмаўляюць нам у падтрымцы. Напрыклад, гайнаўскае кіраўніцтва дапамагло вырашыць праблему абкладання таможнай пошлінай тых сум, якія мы атрымалі з Беларусі. Дадам, што нядаўна нас наведала сеймавая камісія па справах нацыянальных і этнічных меншасцей. Мы расказалі высокім гасцям аб нашых цяжкасцях, падалі ім спіс неабходных матэрыялаў. А з боку паслоў сейма пачулі абяцанне зрабіць усё магчымае, каб выправіць недахопы.

Агульнавядома, што самы дзейсны ўдзел у ажыццяўленні нашай задумкі бралі і бяруць замежныя беларусы Захаду і Усходу. Асабліва вялікі водгалас, 17 тысяч долараў, атрыманы ад землякоў з ЗША, Канады, Англіі, Бельгіі, Францыі, Аўстраліі, ФРГ. Ёсць вялікая надзея, што гэта не апошняе іх слова. Спадзяёмся і на працяг супрацоўніцтва з БССР.

Хацеў бы я з прыемнасцю адзначыць, што і сама грамадскасць Беласточчыны значна актывізавалася апошнім часам, асабліва моладзь, студэнцтва. Усё робіцца на грамадскіх, дабрачынных пачатках. Як бачыце, існуюць-такі падставы для аптымізму.

— Відаць, гэты рух за адраджэнне беларускай культуры, мовы абудзіў і палітычную свядомасць беларусаў беластоцкага краю: у шматпартыйнай сям'і Польшчы з'явілася новая партыя. Якая яе платформа, сацыяльная база, мэты?

— Так. На самай справе некалькі тыдняў таму быў праведзены заснавальніцкі кангрэс, дзе і паўстала Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне. Яго заснавальнікі бачаць партыю незалежнай і некамуністычнай, якая імкнецца да эканамічнай, палітычнай, культурнай самастойнасці беларускай меншасці. Аб'яднанне выступае за аўтанамізацыю, за дыялог з сацыял-дэмакратычнай і іншымі партыямі, з царквой. Новая палітычная адзінка шукае апору ў асяроддзі інтэлігенцыі, студэнтаў, сялянства, моладзі, галоўным чынам. Зроблены першыя спробы практычнай дзейнасці. На тэлебачанні адбылася сустрэча польскіх палітыкаў і актыву з прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей. Абмяркоўваліся вострыя пытанні, якія стаяць на перадку дня міжнацыянальных узаемаадносін. Там выступіў старшыня БДА Сакрат Яновіч і сакратар Віктар Стахвюк. Пасля іх выступлення прысутныя палякі горача даказвалі, што не ведалі гэтай праблематыкі, што здзіўлены праявамі шавінізму ў Польшчы, фактамі негатыўнага стаўлення да дзеячаў беларускай культуры, пісьменнікаў, нашых асяродкаў.

Скарыстоўваючы нагоду, я хацеў бы ад імя грамадскага камітэта сказаць тым суайчыннікам ва ўсіх кутках свету, якія прыслалі свае ахвяраванні на пабудову Беларускага музея, што ім належыць наша самая шчырая падзяка. Лучу з ёю таксама арганізацыі і ўстановы Беларусі, таварыства «Радзіма», усіх індывідуальных ахвярадаўцаў. Падкрэслю, што тыя сродкі, якія мы атрымліваем, адразу накіроўваюцца на месца прызначэння.

Запрашаем да нас у госці альбо на экскурсію ў Гайнаўку, дзе можна знайсці адпачынак і ў недалёкай будучыні—добрыя варункі ў гатэлі музея. Звяртаюся з прапановаю да ўсіх, каго гэта тычыць: Беларускі музей у Гайнаўцы зацікаўлены ў партнёрскіх сувязях з гандлёвымі, рамеснымі і іншымі кааператывамі і суполкамі. Мы ўжо цяпер у стане выконваць заказы на выраб нацыянальных строяў.

Гутарку вёў Кастусь ШАЛЯСТОВІЧ.

ПІШУЦЬ ЗЕМЛЯКІ

ПРЫЦЯГНЕННЕ РАДЗІМЫ

Паважаная рэдакцыя!

Я заўсёды вельмі радуюся, калі прыходзіць пісьмо з дому ці ваша газета. Яны выклікаюць у мяне пачуццё любві і ўздыханні: ах, гэта ж з маёй роднай Беларусі! Многа разоў я бываў у Мінску, гасціў у сястры, наведваў веруючых не толькі ў сталіцы, але і ў іншых гарадах і вёсках Бацькаўшчыны. І ўсюды ўсё мне было мілым і родным. Калі бываю на сходах веруючых і гляджу на твары людзей, яны мне здаюцца такімі блізкімі і дарагімі. Калі іду па вуліцах Мінска, заўсёды ўглядаюся ў кожны дом. У вёсцы любуюся кожным кусцікам, бярозавым гаем. Праязджаючы палі і сенажаці, адчуваю нейкае невытлумачальнае прыцягненне маёй душы да ўсяго гэтага. Так, туга па Радзіме, з'ядае чалавека. Але я ведаю, што людзі, якія жывуць на роднай беларускай зямлі, не быўшы за мяжой, гэтага не ўяўляюць. Яны лічаць, што ў нас на Захадзе цвітуць кветкі ў спёку і ў холад. Толькі гэта міраж, які падманвае чалавека.

Я проста ад душы прызнаюся і пішу вам усім ісціну пасля ўсяго, што я бачыў у Беларусі. Такой любові і адносін я нідзе на Захадзе не сустракаў. У нас тут няма такіх благаславенных сходаў веруючых. Вядома, форма нібыта ёсць, але сілы Божай няма. Я вельмі здзіўлены, што многія веруючыя эмігрыруюць з СССР. Пытаюся сам у сябе, чаму яны едуць на Захад ці ў Амерыку, чаго шукаюць? Цяпер у СССР ёсць свабода: маліся, прапаведуй. Нават у Дамах культуры ўлады дазваляюць праводзіць вечары Бібліі. Некаторыя ўсё гэта пакідаюць, не ведаючы, што іх чакае. Але, калі б маю пенсію перавялі, то я адразу ж вярнуўся б у Мінск, да маіх братоў і сёстраў па веры, незалежна ад таго, хто і як падумаў бы пра мяне: дрэнна ці добра. На гэтым тыдні я атрымаў пісьмо ад аднаго веруючага брата. Ён напісаў так. Маўляў, да нас прыехала многа пяцідзесятнікаў з СССР. Яны спачатку мелі адно ўяўленне, але цяпер яно змянілася: няма работы, жывуць за кошт дапамогі і міласэрнасці. Будучыня ў іх зусім няясная. Пачынаюцца сярод іх спрэчкі, нараканні, маркота і г. д. Я толькі здзіўляюся, як людзі добраахвотна трапляюць у сетку духоўнага падзення. Нікому гэтага не раю рабіць. Колькі ёсць працы на Радзіме сярод хворых, адзінокіх і старых! Чаму пакідаеце свой народ? Адумайцеся і спыніцеся. Пачніце працаваць для свайго народа, на сваёй Радзіме — і Бог будзе з вамі!

М. МЕЛЬНІК.

ФРГ.

ЛЕНИН И СТАЛИН:
ДВЕ ПОЗИЦИИ ПО НАЦИОНАЛЬНОМУ ВОПРОСУ

I.

Десятилетиями советскому народу вдалбливали в голову культовский лозунг «Сталин — это Ленин сегодня». Сейчас стал модным другой лозунг: «Ленин — это Сталин вчера». Действительно, весной 1922 года рекомендовав по совету Льва Каменева Сталина на новый пост в партии — генерального секретаря, который Владимир Ильич рассматривал как чисто технический, организаторский, он уже летом — осенью, узнав во время болезни ближе Сталина, повел с будущим тираном борьбу. А зимой, будучи уже тяжелобольным, обратился с письмом к XII съезду о смещении Сталина с этого поста. Болезнь помешала ему произвести глубокие политические перемены, и главное, произвести коренную перемену взглядов на строительство социализма, на решение сложнейшего национального вопроса.

ТРИ ПРИНЦИПА НАЦИОНАЛЬНОЙ ПОЛИТИКИ

В революцию партия большевиков пришла с программой, 9-й пункт которой провозглашал право на самоопределение за всеми нациями, входящими в состав государства.

В процессе революции и гражданской войны из состава бывшей Российской империи вышли Финляндия и Польша, Украина и Белоруссия, республики Прибалтики и Закавказья. В Средней Азии образовались феодальные ханства. Молдавию захватила боярская Румыния, западным территориям угрожала кайзеровская Германия, Закавказью — англичане. На Дальнем Востоке находились японцы и американцы. На северных и южных окраинах — войска Антанты. Выйдя из империалистической войны, Советская Россия оказалась в гражданской войне. В самой России в 1918—1919 годах центробежные силы достигли максимума — появился десяток квазигосударственных образований.

Однако Советская Россия и в ходе гражданской войны была верна принципу «без аннексий и контрибуций». Уже ставшие советскими Украина и Белоруссия, Грузия, Армения и Азербайджан оставались независимыми республиками, имеющими с ней военно-дипломатический договор о союзе. Внутри самой Советской России были выведены автономии — Татарская и Башкирская республики, а затем и другие.

Что же означало «самоопределение наций» как принцип национальной политики?

Здесь придется углубиться в теорию. Среди множества оттенков и позиций национальной политики различных социальных сил есть три основных принципа, которыми определяется и исчерпывается все ее многообразие.

Первый — отрицание национальных прав, всех и полностью.

Эта позиция характерна для крайних политических течений, причем крайние консерваторы делают исключение для господствующей нации, а крайние революционеры теоретически не делают никаких исключений, но на практике это сути дела не меняет. Отсутствие национальных прав заменяется социальным господством представителей фактически доминирующей нации. При этом неважно, кто ее представляет — помещик, колонизатор или бюрократ.

Второй принцип признает различные права наций, но за обязательным исключением полноты политических прав, т. е. за исключением права нации на свою историческую судьбу, независимость, на отдельное государство.

Эта позиция имеет множество градаций по степени признания за нациями тех или иных прав и присуща широкому спектру политических партий. Этот принцип называется принципом национально-культурной автономии, так как именно признание только культурной автономности наций составляет ее суть.

Третий из основных принципов признает права наций во всей их полноте, включая политические права, настаивая на свободе политического самоопределения наций; именно этим данный принцип отличается от второго. Само собою разумеется, что самоопределение наций либо признается, либо нет, и никаких градаций не имеет. Эта позиция присуща радикальным партиям, и прежде всего международному рабочему движению.

Каждому из основных принципов соответствует своя национальная политика. Принципу самоопределения наций — политика пролетарского интернационализма. Принципу национально-культурной автономии — политика буржуазного национализма. А вот с первым принципом — отрицания национальных прав — дело обстоит сложнее. Там, где эксплуатация других народов носила буржуазный общественный характер, там соответствующая политика приобрела крайнюю форму буржуазного национализма — шовинизм.

Но был и иной вид эксплуатации национальностей, не общественный, а **государственный**. И этот вид характерен прежде всего для России. Здесь не было огромных колониальных компаний по эксплуатации Прибалтики или Украины, Закавказья или Средней Азии, таких, как, например, в Англии Индийская компания. Более того, именно на западных окраинах России, в той же Прибалтике, в Финляндии, Польше капитализм был развит широко, а главное — глубже проник во все общественные отношения, чем в России. Это не отрицало угнетения национальных окраин, но гнет этот носил не общественный, а государственный характер. Не русское общество, не русский народ угнетал другие национальности, а российское государство, самодержавие, бюрократия. И русский народ они угнетали в той же мере, как и другие народы империи. Угнетали экономически, политически, в культуре. Эта политика угнетения называется **великодержавием**.

Политическое сознание великодержавия было присуще и дворнику, и князю из «Союза русского народа», и профессору из партии «октябристов», и беспартийному офицеру, и российскому мещанину. Синдром великодержавия был распространен значительно шире, чем это представлялось в связи с дифференциацией по партийной принадлежности.

Отсюда понятно, что и завоевательный характер победы в гражданской войне («Мы Россию завоевали» — Ленин), и российские традиции отнюдь не способствовали политике пролетарского интернационализма. И все-таки эта политика побеждала.

ПОЗИЦИЯ ПАРТИИ

Какие же взгляды были в партии на национальный вопрос в тот период? В 1919 году на VIII съезде Российской компартии обсуждалась ее новая программа и основная дискуссия вспыхнула как раз по национальному вопросу.

Ленин защищал принцип самоопределения наций — политику пролетарского интернационализма.

Пятаков выступил с отрицанием всякого самоопределения. Его поддержали Сунница и Томский.

Рыков выступил с позиций национально-культурной автономии. Его поддержал Ломов.

Бухарин, «опираясь на заявление» Сталина, предложил формулу самоопределения трудящихся без права наций на самоопределение. Равноправие трудящихся разных национальностей в таком случае означало лишь то, что национальная принадлежность трудящегося не имеет значения. Это был не интернационализм, а национальный нигилизм, т. е. опять-таки великодержавие, индифферентное, равнодушное (пока что!) отношение к своему национальному происхождению.

Хотя ленинскую позицию в принципе прямо не поддержал ни один из выступавших, Ленин настоял на своей формулировке, и съезд принял ее.

Сталин, нарком по делам национальностей, в дискуссию по национальному вопросу на съезде не вступал, отмолчался, спорить с Лениным не стал.

Таким образом, в 1919 году в партии со всей очевидностью проявились все основные политические принципы по национальному вопросу.

Рязанов, один из делегатов, будущий директор института Маркса-Ленина, тогда заметил, что партия совершенно не подготовлена к тому, чтобы разобраться в вопросе о праве наций на самоопределение. Пожалуй, верно. Что было в России, то было и в партии, и потому ситуация была чревата кризисом. Он разразился в 1922 году.

Политическая борьба в руководстве партии в 1922 — 1923 годах была связана в основном с изменением национальной политики РКП (б), что привело постепенно к сталинскому национально-государственному переустройству страны и созданию вместо федерации независимых и равных республик унитарного государства.

Виктор ДОРОШЕНКО.

ЛИСТАЯ ПОДШИВКИ «РУССКОГО ГОЛОСА»

И ОНИ ПРИБЛИЖАЛИ ТОТ ДЕНЬ

АМЕРИКА пока еще живет обычной, мирной жизнью, но на горизонте сгущаются грозовые тучи. В Европе идет война. Гитлеровские захватчики уже хозяйничают в Польше, Дании, Норвегии, Бельгии, Голландии, Люксембурге, Греции, Югославии, Франции. Продолжаются варварские бомбардировки городов Великобритании. В эфире истерические вопли Гитлера, угрожающего всему миру, — речь идет об осуществлении бредовых планов установления мирового господства фашистского рейха. Народ Соединенных Штатов встревожен.

Страницы «Русского голоса» широко освещают события, происходящие в мире. Премьер-министр Великобритании Чемберлен заявил: «Если действительно таково стремление рейха — добиться господства в Европе, а, возможно, еще и дальше, — то это вызовет успешное сопротивление правительств тех стран, чья свобода ставится под угрозу». Речь идет о создании надежного и эффективного оборонительного фронта неагрессивных держав. К ним прежде всего относится Советский Союз. В. Яхонтов, Д. Крынкин, В. Казакевич, другие руководители и активисты патриотического движения в США идут в Русские народные дома, клубы, церкви, используют любую возможность, чтобы донести живое слово правды до тех, кто хочет услышать его.

«Нужна ли война американскому народу?» — тема лекций и газетныхх выступлений доктора Крынкина, редактора «Русского голоса». Одна за другой появляются в газете статьи генерала Яхонтова. По-военному четко и кратко говорит он о том, что происходит в Европе, дает ясную оценку международных событий, связанных с начавшейся второй мировой войной.

Обеспокоены наши соотечественники, живущие в США. Там, за океаном, их Родина, над которой нависла опасность агрессии. «Русский голос» публикует письма своих читателей — за перо берутся даже те, кто никогда прежде не писал в газету.

«Мне слышится война сильнее, чем раскаты грома...» Автор этих строк Прокофий Левонюк еще не знает, что через три месяца гитлеровцы нападут на Советский Союз, зальют кровью его родную Белоруссию. Он, как и тысячи его земляков, оказавшихся в Америке, заверяет в верности Отечеству даже в самую тяжелую годину.

Верность Отечеству... Глубочайший смысл этих слов подтвердят и докажут грядущие события.

22 июня 1941 года США узнали о вероломном нападении Германии на СССР. Поднялась, забурлила русская Америка. В Нуарке и Филадельфии, Питтсбурге и Кембридже, в других городах прошли массовые митинги в поддержку Советского Союза. В письмах выходцев из Белоруссии, Украины, России, в заявлениях прогрессивных клубов, землячеств, других общественных организаций, опубликованных в «Русском голосе», прямой и откровенный ответ на главный вопрос, поставленный историей: что делать им в дни суровых испытаний, когда Отечество в опасности? Отныне все их усилия будут направлены на помощь сражающемуся с фашизмом советскому народу. Отныне — все во имя Победы!

Автор одного из писем, опубликованных в «Русском голосе» под заголовком «Как я встретил войну», Николай Севоев пишет: «Зашел в аптеку. Неожиданно вбежал мальчик и выпалил: «Германия объявила войну России!» Он это слышал по радио. Я поспешил домой. Включили с женой радио и до утра не смыкали глаз, слушая волновавшие нас новости. Корреспонденты и военные эксперты всю ночь комментировали сложившуюся в мире обстановку. Мне вспомнились в ту ночь известные строки поэта Тютчева:

Умом Россию не понять,
Аршином общим не измерить:
У ней особенная стать —
В Россию можно только верить...

Уже тогда не было сомнений: агрессор получит по заслугам. Мы знали: советские люди, все как один, встанут на защиту Родины. Мы знали и то, что предстоит самая жесткая в истории человечества борьба двух миров».

Через неделю после начала Великой Отечественной войны «Русский голос» публикует обращение Национального исполнительного комитета русско-американской секции Интернационального рабочего ордена (ИРО):

«Дорогие братья, сестры, граждане! Гитлеровские орды совершили нападение на нашу Родину.

Трудящиеся Америки, всех стран желают Советскому Союзу победы! Англия и США обещали свою поддержку СССР. Своими настойчивыми требованиями обеспечим оказание незамедлительной помощи СССР. Мы обращаем свой призыв ко всем американским братским организациям, которые не хотят, чтобы мир был порабощен фашизмом, ко всем людям доброй воли: объединим наши голоса в едином требовании, чтобы помощь Советскому Союзу была оказана быстро и в полной мере».

Речь шла об открытии второго фронта в Европе. Этого требовали видные американские деятели, прогрессивные организации, этого хотел весь американский народ.

Теперь страницы «Русского голоса» заполнены военными сводками о том, что происходит на советско-германском фронте. Газета несет суровую правду, ничего не скрывая, ни о чем не умалчивая: вооруженные до зубов фашистские захватчики рвутся к жизненно важным центрам Отечества. Оккупирована территория Белоруссии, идут упорные, кровопролитные бои. Враг рвется к Москве, считанные километры остаются до столицы. На 7 ноября 1941 года, день 24-й годовщины Октября, Гитлер уже назначил парад на Красной площади.

В Нью-Йорке, Бронксе, Клифсайде, Бронзвилле, Балтиморе, Веллингтоне, Массачусетсе, во многих уголках Америки создаются Комитеты помощи Родине, проходят многотысячные митинги, лекции, концерты, сборы от которых идут в фонд помощи Красной Армии. По американскому радио звучит речь, подготовленная сотрудником «Русского голоса» Сергеем Курнаковым — «Будем крепить свои ряды!»

Галина ЕВДОКИМОВА.

(Продолжение следует).

Начало в №№ 10—13.

У ЗАХОДНЕНЯМЕЦКІХ СЛАВІСТАЎ

НАША КУЛЬТУРА Ў ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ

У апошнія гады з прычыны цікавасці да даследавання праблем беларуска-заходнееўрапейскіх літаратурных сувязей усталявалася перапіска з многімі славістамі Заходняй Еўропы, у тым ліку і ФРГ. Наладжваюцца кантакты з усімі, хто хоць як праяўляе цікавасць да беларускай тэматыкі, каб падтрымліваць традыцыі былых культурных зносін, прыпыніць тэндэнцыю да іх скарачэння і заняпаду.

Мая камандзіроўка ў Заходнюю Нямеччыну адбылася дзякуючы запрашэнню дырэктара Славяна-Балтыйскага семінара Мюнстарскага універсітэта прафесара Ф. Шольца. Гэта, безумоўна, вынік больш чым двухгадовай перапіскі з прафесарамі Х. Ротэ, Ф. Шольцам, К. Зееманам, В. Казакам і іншымі нямецкімі вучонымі. У ёй не раз падымаліся пытанні пра лёс даследаванняў беларускай культуры ў ФРГ, пра падрыхтоўку нямецкіх славістаў да славутага скарынінскага юбілею. Найбольш надзей ускладалася на перапіску з прафесарамі Х. Ротэ і Ф. Шольцам, і не выпадкова, таму што добра вядома: абодва маюць дачыненне да беларусістыкі, абодва з'яўляюцца вядучымі славістамі ў Заходняй Нямеччыне і, пэўна, асабліва могуць уздзейнічаць на працэс узнаўлення і пашырэння беларуска-нямецкіх культурных сувязей. І, як высветлілася, спадзяванні спраўдзіліся.

Ханс Ротэ належыць да ліку найбольш вядомых заходнянямецкіх славістаў. Ён прафесар славянскай філалогіі Рэйнскага універсітэта ў Боне, правадзейны член Рэйн-Вестфальскай Акадэміі навук, член Міжнароднага камітэта славістаў, адзін з віцэ-прэзідэнтаў МАВІРСК, заснавальнік некалькіх вядомых у Заходняй Нямеччыне серыйных выданняў па славістыцы. Займаецца праблемамі ўсходнеславянскіх культур. У 1982 годзе ў Мінску, на Міжнароднай навуковай канферэнцыі ЮНЕСКА «Славянскія культуры і сусветны культурны працэс» ён выступіў з праблемным дакладам «Узнікненне славянскіх культур і іх значэнне ў сённяшнім свеце», дзе, хаця і ў нязначнай ступені, прычыніўся да беларускай тэматыкі, да праблем скарыназнаўства. Як сведчаць ягоныя публікацыі, прафесар Ротэ і раней праяўляў цікавасць да беларускай культуры: выпусціў зборнік старажытных вершаў усходніх славян, у тым ліку беларускіх «Самая старажытная ўсходнеславянская паэзія. 1575 — 1647». У 1985 годзе ў верасні прыняў удзел у канферэнцыі, арганізаванай Англа-беларускім таварыствам і Школай славянскіх і ўсходнееўрапейскіх даследаванняў Лонданскага універсітэта, — «Францыск Скарына і Рэнесанс на Беларусі», дзе выступіў з дакладам «Гукі і словы: роздум над прачытаным Скарынаю», які пазней быў надрукаваны ў «Часопісе беларускіх даследаванняў», што поўнасцю прысвечаны Скарыне.

У час камандзіроўкі мне была прадастаўлена магчымасць пазнаёміцца з нямецкімі славістычнымі цэнтрамі — работай Славяна-Балтыйскага семінара, яго вядучымі супрацоўнікамі, аспірантамі і студэнтамі і Інстытута славістыкі Кёльнскага універсітэта. Акрамя таго, прафесар Шольц з вялікім задавальненнем паказаў [мне] вельмі дбайна ўкамплектаваную бібліятэку семінара. Яна выдатна папоўнена рускай класічнай і савецкай літаратурай, няблага — украінскай і літаратурамі прыбалтыйскіх краін. На жаль, аддзел беларускай літаратуры вельмі небагаты. Дзве невялікія паліцы робяць даволі прыкрае ўражанне.

У Заходняй Германіі мне была дадзена магчымасць выступіць з дакладамі «Да гісторыі нямецка-беларускіх культурных і літаратурных сувязей» перад супрацоўнікамі і студэнтамі Славяна-Балтыйскага семінара і «Успрыняцце і інтэрпрэтацыя беларускай літаратуры ў Заходняй Нямеччыне» — у Інстытуце славістыкі Кёльнскага універсітэта. Яны былі скіраваны на тое, каб звярнуць увагу славістаў ФРГ, што беларуска-нямецкія літаратурныя сувязі маюць значныя традыцыі. Яшчэ больш шырока быў раскрыты іх сучасны стан, вызначаны іх перспектывы — паказана, якое шырокае поле дзейнасці чакае нямецкіх славістаў ва ўсіх напрамках даследавання беларускай культуры: мовы, літаратуры, гісторыі, фальклору, этнаграфіі, мастацтва, на ўсіх этапах духоўнага сударкранання двух народаў. На мой погляд, менавіта апошні аргумент быў самым пераканаўчым і моцным на карысць беларусістыкі.

У час выступленняў, гутарак з нямецкімі вучонымі і студэнтамі ўзнікалі шматлікія пытанні. Яны сведчылі пра значную цікавасць і пэўную зарыентаванасць нямецкай інтэлігенцыі ў беларускай праблематыцы. Пытанні, галоўным чынам, датычыліся палітычнага і культурнага аспектаў сучаснага стану Беларусі. Больш за ўсё прысутных цікавіў лёс беларускай мовы і культуры, працэс нацыянальнага адраджэння, дзейнасць нефармальных беларускіх аб'яднанняў, Чарнобыль, Курапаты і шмат іншага.

У гутарках з нямецкімі вучонымі абодвух славістычных цэнтраў, са славістамі зямлі Рэйн-Вестфалія ў Дзюсельдорфе адбыўся цікавы абмен думкамі пра бліжэйшыя мажлівасці навуковага супрацоўніцтва. Яны выказалі пажаданне і цвёрдую ўпэўненасць у неабходнасці пашырэння далейшых кантактаў, правядзення сумесных сустрэч, сімпозіумаў, канферэнцый на розных узроўнях.

У якасці першага буйнога кроку ў гэтым напрамку нямецкі бок прапанаваў на пачатку мая 1990 года правесці Міжнародны навуковы сімпозіум у Мюнстары на тэму «Беларусь і Захад» з запрашэннем групы беларускіх вучоных АН БССР. Ад Інстытута літаратуры — А. Мальдзіса, У. Сакалоўскага, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору — К. Кабашнікава, З. Мажэйка, музея старажытнага беларускага мастацтва — Ю. Хадыку, ад Мінскага педінстытута імя Горкага — П. Садоўскага. У ім прымуць удзел нямецкія славісты — прафесары Г. Андрыяні, Е. Гёш, Х. Хардэр і англічане — прафесар А. Макмілін і інш. Акрамя таго, запрошана вялікая група заходнянямецкіх вучоных, аспірантаў і студэнтаў славістычных аддзяленняў універсітэтаў у якасці гасцей і слухачоў. Матэрыялы сімпозіума будуць апублікаваны. Больш таго, прафесар Шольц прапанаваў на базе Славяна-Балтыйскага семінара арганізаваць групу паскоранага абучэння беларускай мове. З гэтай мэтай у 1990 годзе будзе зроблены зварот да ўрада Рэйн-Вестфалія з прапановай вылучыць неабходную суму (каля 150 тысяч заходнянямецкіх марак) для падрыхтоўкі падручніка інтэнсіўнага навучання беларускай мове па ўзору тых, якія ўжо складзены для падобных груп літоўскай, латышскай і эстонскай моў. Такую групу з дзесяці студэнтаў плануецца падрыхтаваць у бліжэйшыя дваты гады. Нямецкія славісты маюць надзею, што беларускі бок забяспечыць іх двухмесячнымі летнімі курсамі практычных заняткаў па беларускай мове. У сувязі з тым, што зараз пры Беларускім дзяржаўным універсітэце ствараецца Міжнародная летняя школа беларускай мовы, літаратуры і культуры, ёсць надзея, што яна і стане тым цэнтрам, дзе змогуць ажыццяўляцца падобныя курсы.

Выказвалася прапанова пра мэтазгоднасць усталявання пастаянных сувязей паміж нямецкімі даследчымі ўстановамі і беларускімі навуковымі цэнтрамі. Беларускі дзяржаўны універсітэт выказаў згоду на такое супрацоўніцтва. У той жа час славісты Заходняй Нямеччыны выказалі здзіўленне, што беларускі бок так мала клапоціцца пра ўзаемны абмен інфармацыяй, наладжванне навуковых кантактаў, пра лёс сваёй культуры за рубяжом. Як вядома, адсутнасць навуковых сувязей вельмі адмоўна адбілася на даследаваннях беларусістыкі ў ФРГ. Такія абставіны не дазвалялі камандзіраваць нямецкіх вучоных у Беларусь, дзе яны маглі б працаваць з неабходнай літаратурай. Адсюль і невялікая колькасць публікацый пра беларускую культуру ў Заходняй Германіі.

У гэтых гутарках мяне больш за ўсё ўразіла эфектыўнасць і свабода дзеянняў, з якімі вырашаюцца наспеўшыя праблемы. Тое, што нямецкія вучоныя вырашалі з зайздроснай аператыўнасцю літаральна на працягу некалькіх гадзін, у нас робіцца месяцамі, а падчас і гадамі.

Безумоўна, важнае значэнне для пашырэння даследаванняў па беларускай тэматыцы, выхаду беларускай літаратуры на міжнародную арэну, падключэнне яе да кантэксту развіцця сусветнага літаратурнага працэсу мела б далучэнне прагрэсіўных нямецкіх славістаў, буйных спецыялістаў па лінгвістыцы, літаратуразнаўству, гісторыі і мастацтву да беларускай праблематыкі. Лепшыя работы замежных вучоных можна было б перакладаць на беларускую мову і выдаваць у рэспубліцы, што ўжо паспяхова робіцца на ўсесаюзным узроўні выдавецтвамі «Прагрэс», «Навука» і інш. Першыя спробы адбываюцца і ў Беларусі. Адно з заходніх выданняў — манаграфія А. Цеханавецкага «Міхал Казімеж Агінскі і яго палац музаў у Слоніме» (арыгінальнае даследаванне па культуры Беларусі XVIII стагоддзя) ужо перакладаецца на беларускую мову. Вядуцца перагаворы аб перакладзе і выданні прыкметнай працы італьянскай славісткі Эмануэлы Згамбаці «Трыстан беларускі». Актыўнае падключэнне ў гэты працэс заходнянямецкіх славістаў, як нам здаецца, вельмі дапамагло б агульнымі намаганнямі хутчэй ліквідаваць усё яшчэ шматлікія белыя плямы на карце беларускай культуры.

У час знаходжання ў ФРГ радавала тое, што нямецкія вучоныя не засталіся абыякавымі да праблем беларусістыкі. Шмат увагі да яе праявілі прафесары Ротэ, Обст і асабліва Шольц. Першы з іх рыхтуе да 500-гадовага юбілею Ф. Скарыны факсімільнае выданне яго «Бібліі» з каментарыямі, падрыхтаванымі вядомымі вучонымі Захаду — А. Макміліным і А. Надсонам, што выйдуць асобным томам. Яна будзе выпушчана ў серыі «Біблія славіка» — новым вельмі каштоўным і арыгінальным серыйным выданні. Заснавальнікі гэтай выдатнай серыі старажытнаславянскіх помнікаў Райнхальд Олеш і Ханс Ротэ маюць намер найбольш цікавыя помнікі культуры славян «зрабіць набыткам славістаў, тэолагаў, гісторыкаў культуры, бібліяфілаў і не ў апошнюю чаргу тых, хто ў мове гэтых перакладаў «Бібліі» бачыць таксама том сваёй уласнай гісторыі». У серыі прадугледжваецца выпуск напачатку 14 тамоў, сярод іх трох беларускіх. Акрамя Скарынінскай будуць выдадзены Радзівілаўская Біблія 1564 года і Біблія Сымона Буднага 1572 года. Факсімільныя выданні будуць адпавядаць памерам арыгіналаў. Усе тамы забяспечваюцца каментарыямі, што будуць зроблены прафесійнымі спецыялістамі, якія, на думку аўтараў, нададуць выданню асаблівую каштоўнасць. Акрамя таго, прафесар Ротэ мае намер на Міжнародным навуковым сімпозіуме «Беларусь і Захад», які адбудзецца ў Мюнстары з 3 па 6 мая 1990 года, выступіць з дакладам «Беларускі пераклад Бібліі гуманіста Францыска Скарыны».

Прафесар Шольц таксама праявіў павышаную цікавасць да Беларусі. Ён неаднаразова звяртаўся да пытанняў развіцця гісторыі беларускай культуры. Яго асабліва хвалявалі тыя моманты, дзе ішла гаворка пра сувязі абедзвюх культур — беларускай і нямецкай, пра ўплывы нямецкай на беларускую. Вельмі высока ацаніў і шчыра зацікавіўся ён творчасцю М. Багдановіча і мае намер на гэтым жа сімпозіуме выступіць з дакладам «Максім Багдановіч — беларускі паэт еўрапейскага мадэрнізму».

Ульрых Обст бачыць далучэнне да беларускай тэматыкі праз рэалізацыю сваёй капітальнай працы, прысвечанай аналізу вылучэння са старажытнарускай трох славянскіх моў — беларускай, рускай, украінскай. Двое студэнтаў Кёльнскага універсітэта К. Шторк і Д. Зіберт аддалі перавагу беларусістыцы.

Падчас гутарак з нямецкімі славістамі яны не раз засяроджвалі ўвагу на прычынах, якія, на іх думку, тармазілі і прадаўжаюць ўсё яшчэ тармазіць працэс даследавання беларускай культуры на Захадзе. Найбольш значнымі з іх яны лічаць тое, што да сёння адсутнічае пастаянны і шырокі кнігаабмен па гуманітарных навуках, што з Беларусі не было мажлівасці атрымліваць аніякія перыядычныя выданні, ні заказаць, ні падпісацца на іх. Спробы наладзіць кантакты з беларускімі даследчымі цэнтрамі не давалі дадатных вынікаў. Такая спроба была зроблена вядучымі нямецкімі славістамі падчас канферэнцыі ЮНЕСКА ў Мінску ў 1982 годзе. Аднак беларускія вучоныя ўніклі такіх размоў. Не садзейнічала праяўленню цікавасці да беларускай тэматыкі і тое, што беларуская мова паступова, але сістэматычна і няўхільна выходзіла з шырокага грамадскага ўжытку. У гэтым яскрава пераканаліся нямецкія славісты на той жа канферэнцыі ЮНЕСКА ў Мінску, «калі на агульным пасяджэнні на беларускай мове выступілі толькі два славісты — англічанін А. Макмілін і немец Ф Шольц, — сведчыць прафесар Ротэ. — Пра якое вывучэнне беларускай мовы магла ісці гаворка, калі ва ўласнай рэспубліцы яна лічылася непатрэбнай. Акрамя таго, у нас склалася такое ўражанне, што аніхто не займаўся прапагандай беларускай культуры, не быў зацікаўлены ў яе распаўсюджанні». І, пэўна, нямецкія славісты мелі рацыю.

Штучнае тармажэнне развіцця беларускай мовы, паступовае выключэнне яе са сферы дзяржаўнага, а затым і грамадскага ўжытку прывяло да адчувальнага запавольвання руху беларускай культуры, значнага зніжэння цікавасці да вывучэння яе даўніх і багатых традыцый. Зарубежныя вучоныя-энтузіясты, якія прадаўжалі яе даследаванне, не атрымлівалі належнай падтрымкі з нашага боку, а часцей, наадварот, іх погляды ганьбаваліся, а працы ў большасці выпадкаў неабгрунтавана асуджаліся. Наглядалася адсутнасць шырокага кнігаабмену па гуманітарных навуках, а тыя матэрыялы па зарубежнай славістыцы, што атрымліваліся, надзейна захоўваліся ў спецхранах і архівах — усё гэта, натуральна, не магло не адбіцца самым адмоўным чынам на развіцці культурных сувязей Беларусі з зарубежнымі краінамі, асабліва заходнееўрапейскімі і паўночнаамерыканскімі.

У той час, калі Інстытут сусветнай літаратуры імя М. Горкага і іншыя вядучыя культурныя ўстановы Расіі наладжвалі кантакты з многімі дзесяткамі зарубежных цэнтраў, праводзілі шматлікія сімпозіумы, канферэнцыі, калёквіумы, «круглыя сталы» па рускай класічнай і савецкай літаратуры, калі рускія вучоныя шматлікімі групамі выязджалі ў замежныя камандзіроўкі з мэтай папулярызацыі і распаўсюджання там рускай класічнай і рускай савецкай літаратуры і культуры, у Беларусі ўсё адбывалася наадварот. Беларускім вучоным гуманітарнага профілю пад рознымі падставамі як на саюзным, так і рэспубліканскім узроўні не давалі мажлівасці выехаць за мяжу. Усё гэта, безумоўна, прыводзіла да катастрафічнага зніжэння цікавасці ў заходняй славістыцы да беларускай праблематыкі. Як такі стан рэчаў адбіўся на даследаваннях беларускай культуры ў Заходняй Нямеччыне, яскрава сведчаць даныя пра вывучэнне моў. Так, у ФРГ у 80-я гады вывучалі ва універсітэце на славістычных факультэтах наступныя мовы: рускую — 22 групы, чэшскую — 16, польскую — 15, балгарскую — 12 і г. д. Такія нязначныя па колькасці насельніцтва нацыі мелі свае пастаянныя групы: сербахарваты — 9, лужычане і багемцы — па адной. Нават царкоўнаславянская мова вывучалася ў 3 групах, не было толькі ні адной групы беларускай мовы, не толькі пастаяннай, але і часовай.

Усе гэтыя негатыўныя бакі працэсу культурных сувязей, узятыя разам, бясспрэчна, станавіліся значным тормазам на шляху даследавання беларускай культуры на Захадзе, у тым ліку і ў ФРГ.

Сёння, у час палітыкі публічнасці, дэмакратызацыі, новага мыслення, перавагі агульначалавечых каштоўнасцей перад класавымі, паступова мяняюцца адносіны да літаратуразнаўства і славістыкі Захаду, да развіцця беларуска-нямецкіх літаратурных сувязей. Аднак спадчына мінулага: дагматызм, інертнасць, страх перад нязвыклым — дастаткова моцна даюць пра сябе знаць, таму пашырэнне і паглыбленне гэтых сувязей праходзіць пакуль што ўсё яшчэ запаволена, без належнай ініцыятывы. І ўсё ж хацелася б спадзявацца, што натуральнае імкненне беларускай культуры да шырокага еўрапейскага кантэксту знойдзе і належны водгук, і надзейнае разуменне, і сваё сапраўднае вырашэнне. Таму, на наш погляд, неабходна вітаць і падтрымліваць першую спробу заходнянямецкіх славістаў уступіць у шырокія навуковыя кантакты з беларускімі даследчыкамі і, са свайго боку, прыкласці ўсе намаганні, каб развіваць гэты працэс, які падае вялікія надзеі.

Уладзімір САКАЛОЎСКІ.

ТЭАТР ВА ЎМОВАХ ПЕРАБУДОВЫ

МУЗА І КАМЕРЦЫЯ

Гэтыя ўзаемавыключальныя на першы погляд паняцці папулярны артыст Алег ТАБАКОЎ ставіць побач. У Саюзе тэатральных дзеячаў (СТД) РСФСР Табакоў — адзін з сакратароў праўлення і старшыня замежнай камісіі. З ім гутарыць карэспандэнт АДН.

— Хацеў бы перш за ўсё адзначыць адну рэч. Існаваўшая многія дзесяцігоддзі «табель аб рангах» тэатраў, якія «выпускалі» за мяжу, паслядоўна разбураецца — не без дапамогі нашых замежных партнёраў. Ім цікавыя калектывы, дзе шукаюць уласны стыль, імкнуцца да арыгінальнай творчай манеры.

— Але ўсё-такі часцей гастралююць трупы з Масквы, Ленінграда, яшчэ двух-трох буйных гарадоў?

— Пакуль так. І гэта натуральна. Не трэба рабіць выгляд, што з пачаткам перабудовы рэальны попыт стаў зыходзіць выключна з прынцыпаў тэрытарыяльнасці. Іншая справа, што ў расійскай правінцыі ёсць калектывы, якія знаходзяцца на ўзроўні, можна сказаць, сусветных стандартаў, але замежныя калегі іх работы, на жаль, не ведаюць. Задача СТД — зацікавіць нашых партнёраў такімі тэатрамі, як, напрыклад, Свярдлоўскі оперны, драматычныя калектывы Саратава, Ліпецка, Якуцка. Якуцкі калектыў на чале з А. Барысавым, тэатр з Ліпецка пад кіраўніцтвам В. Пахомава — не правінцыя, іх работы могуць аказаць гонар любой сталічнай трупе. Як зацікавіць? Па-першае, з дапамогай сродкаў масавай інфармацыі. Падругое, відэакасеты з запісамі цікавых пастановак дапамогуць «праштурхнуць» прадукцыю, калі лічыць спектакль канчатковым прадуктам тэатральнай «вытворчасці». Але нельга апрыоры ставіць пытанне так: не паедзе маскоўскі калектыў, бярыце тэатр, скажам, з Кургана. Гэта нонсенс! Замежныя калегі самі павінны выбраць, і выбар іх павінен быць заснаваны на веданні спектакляў.

— Ці можна лічыць, што ваша жаданне пазнаёміць з савецкім тэатрам замежных калег супадае з іх імкненнямі?

— За трыццаць гадоў работы ў мастацтве я назіраю падобны выбух цікавасці другі раз. Першы быў у часы хрушчоўскай адлігі. Сёння ўвага да нашай краіны носіць больш канкрэтны характар. І нашы партнёры хочуць надаць кантактам даўгачаснасць.

Неабходна расшырыць супрацоўніцтва паміж студэнтамі: ГІТІСа — з тэатральнымі школамі Даніі, вучылішча імя Шчэпкіна і Школы-студыі МХАТ — з амерыканскімі. Восенню 1988-га ўвесь курс Школы-студыі МХАТ паехаў у Лондан — вядучыя англійскія акцёры вучылі студэнтаў сакрэтам прафесіі. Вельмі сур'ёзнай акцыяй стаў Інтэрподзіум-89 — міжнародны фестываль студэнцкіх спектакляў у Маскве.

Разлічваем атрымаць фінансавую выгаду ад адкрыцця ў краіне курсаў і семінараў. Калі амерыканскія студэнты плацяць за вучобу ў Оксфардзе, дзе выкладаюць савецкія майстры, то чаму б юнакам і дзяўчатам з ЗША не праехаць яшчэ паўтары-дзве тысячы кіламетраў і не заплаціць тую ж суму, так сказаць, першакрыніцы — педагогам той тэатральнай сістэмы, да якой яны так цягнуцца (я маю на ўвазе школу Станіслаўскага, школу рускага рэалізму)?

— З вашых слоў вынікае, што тэатральнай адукацыі СТД удзяляе самую пільную ўвагу. Але, па-мойму, пакуль саюз укладвае значна больш сродкаў, чым атрымлівае.

— Не ўсё ж можна мераць грашыма, многае робіцца дзеля прэстыжу, для міжнароднага прызнання. Хачу падкрэсліць, што СТД Расіі ўкладвае грошы — і немалыя! — у гэтыя мерапрыемствы, якія не абяцаюць даходаў. Але СТД ідзе на гэта свядома, таму што сродкі выкарыстоўваюцца для будучага пакалення расійскага тэатра. Фальшывая пасылка аб прыбытковасці тэатра ці то па глупству, ці то па наведанню была ў свой час выказана нейкім чыноўнікам і падтрымана халуямі ад культуры. Ідэя самаакупнасці сцэнічнага мастацтва неабгрунтаваная. Ва ўсім свеце тэатры зарабляюць шостую, там-сям пятую — гэта максімум! — частку свайго бюджэту. Трупы існуюць за кошт муніцыпальных датацый, прыватных фондаў спонсараў, мецэнатаў. У нас жа, на жаль, не адменены астаткавы прынцып фінансавання культуры.

Аднак СТД умудраецца сам сябе фінансаваць. Заснавальніца УТТ вялікая актрыса Марыя Савіна была жанчынай мудрай і дальнабачнай. Яна стварыла пазыковую касу, якая, натуральна, не магла існаваць на пустым месцы. Узніклі майстэрні, рамесныя карпарацыі — нарадзілася цэлая прамысловасць. У мадэрнізаваным выглядзе яна існуе ў наш час: фабрыкі, што выпускаюць касметыку і тэатральны рэквізіт, сетка дамоў адпачынку і творчасці таксама дае прыбытак.

— Ці не збіраецца саюз пасылаць сваіх стыпендыятаў на вучобу ў іншыя краіны?

— Складанае пытанне. Мы пачалі практыкаваць кароткатэрміновыя стажыроўкі студэнтаў, але пакуль яны носяць адзінкавы характар. Такія камандзіроўкі вельмі важныя — вырваныя са звыклага асяроддзя, пастаўленыя ў экстрэмальныя ўмовы (як гаворыцца, са сваім статутам у чужы манастыр не ходзяць), маладыя хутчэй становяцца дарослымі, у іх узнікае адчуванне ўнутранай свабоды. Разам з пачуццём адказнасці за даручаную справу расце іх грамадзянская самасвядомасць.

Калі гаварыць аб стажыроўках, то больш за ўсё яны патрэбны будучым менеджэрам. У нас слова «адміністратар» — сінонім «даставалы», «штурхача». А ў іх яны арганізатары тэатральнага працэсу!

—Вы аптыміст. Вас паслухаць — усё цудоўна. Але, па-мойму, вы бачыце ўсё ў занадта ружовым святле...

— Чаму ж? Я добра разумею, што магчымасці, якія з'явіліся ў сувязі з перабудовай, тояць па меншай меры дзве небяспекі. Першая — празмерная камерцыялізацыя тэатральнай справы, другая — зніжэнне прафесійнага ўзроўню. Пытанне ўдасканалення сябе ў прафесіі стаіць сёння першым. Так, я — аптыміст і ўпэўнены, што калі-небудзь (толькі калі?) утрасуцца і складанасці з нашым «неназойлівым» сервісам. Але калі рэктара тэатральнай школы з ЗША пасяляюць у нумар без элементарных выгод, у гасцініцу на ўскраіне Масквы, наўрад ці захочацца яму прыехаць другі раз. Нашы кантакты яшчэ вельмі слабыя.

Ды і мы іншы раз спрабуем па-старому зарэгламентаваць сітуацыю. А людзі хочуць бачыць таго, каго яны хочуць, размаўляць з тым, з кім яны хочуць, а не з тым, каго ім спрабуюць «падсунуць» афіцыйныя асобы.

Адзіна правільны шлях — максімальнае задавальненне інтарэсаў нашых партнёраў.

— Цяпер іншы раз нашага акцёра прасцей убачыць за мяжой, чым на роднай сцэне. Не перабраць бы... У вас не ўзнікае падобных апасенняў?

— Так, я падзяляю вашу трывогу: сённяшняя ўсёеднасць рыхтуе нашу заўтрашнюю непатрэбнасць. Як бы ні цаніліся спектаклі на знешнім рынку, мы абавязаны ведаць іх сапраўдную цану ўнутры краіны. Бо чаго мы вартыя, калі не зможам хаця б на мікрон памяняць нешта ў нашым жыцці? У чым тады сэнс нашай дзейнасці? Інтэлігент усё мерае па «гамбургскаму кошту». Не дрэнна было б прымяніць яго і да служыцеляў мастацтва...

— Мне ўспомніліся словы рэжысёра Анатолія Васільева: «Сённяшні тэатр — пакутлівы пераход ад мінулага да будучыні, сённяшнія практыкі — дошкі, з якіх могуць атрымацца нядрэнныя масткі для будучых пакаленняў».

— У такім выпадку я згодны быць дзеравяшкай!

Вяла гутарку Алена ЗОНІНА.

«Выдатныя працаўніцы, вялікія паклонніцы народнай песні», — такія словы можна пачуць пра іх сярод завадчан. А песня заваладала сэрцамі дзяўчат яшчэ ў далёкім дзяцінстве. Потым яны спявалі не раз у канцэртах мастацкай самадзейнасці, займаліся ў ансамблі народнай песні Мінскага трактарнага завода, удзельнічалі як выканаўцы песень у адным з дакументальных фільмаў, здымачная пляцоўка якога была ў Траецкім прадмесці. Наталля МАКРЫШ (злева) працуе на ГПЗ-11, а Галіна ПАДДУБСКАЯ — машыніст помпавых установак цепласілавога цэха Мінскага трактарнага завода. Цяпер яны — удзельніцы народнага хору народнай песні Палаца культуры Белсаўпрофа.

Фота В. РАМАШКІ.

«МІНСКАЯ ВЯСНА-90»



У сталіцы рэспублікі адбыўся фестываль сучаснай музыкі «Мінская вясна».

— У рамках фестывалю, які праходзіў з 10 па 17 красавіка— трынаццаць канцэртаў,—расказвае мастацкі кіраўнік Белдзяржфілармоніі Юрый Гільдзюк.—Значная частка праграмы была адведзена новай беларускай музыцы. Адбыліся сімфанічныя прэм'еры Г. Вагнера, Л. Шлег, А. Бандарэнкі, С. Бельцюкова, аўтарскія вечары камернай музыкі І. Лучанка, В. Капыцькі, сустрэчы з сапраўднымі энтузіястамі новай музыкі—лепшымі спевакамі і музыкантамі рэспублікі.

Межы традыцыйнага фестывалю расшыраюцца. Палітру музычнага свята на гэты раз узбагацілі струнны квартэт з ФРГ з сучаснай музыкай кампазітараў гэтай краіны і камерны ансамбль Літоўскай нацыянальнай філармоніі з праграмай, складзенай з твораў Відмантаса Бяруціса і славутага квартэта А. Месіяна «На канец часу». У дні фестывалю адбыліся таксама першыя выкананні ў Мінску твораў А. Шнітке, А. Эшпая, Э. Дзянісава. Вялікай падзеяй для філармоніі стала выкананне трэцяй сімфоніі А. Шнітке. Упершыню сустрэліся з музыкай чэшскага кампазітара Іржы Лабурды. Адзін з канцэртаў быў аддадзены вельмі цікавым творчым эксперыментам маскоўскага кампазітара Уладзіміра Рабава і мінчаніна Віктара Капыцькі.

Многае ў праграме «Мінскай вясны» звязана з імем Францыска Скарыны, чыё 500-годдзе адзначаецца сёлета. Яму прысвечана араторыя «Іканастас» Л. Шлег, сімфонія «Памяць зямлі» А. Мдзівані і іншыя творы. Тэма Скарыны, гістарычнай спадчыны беларускай культуры—адна з галоўных на фестывалі.

Пошукі, эксперымент, новая музычная мова, новыя прыёмы мастацкага ўздзеяння характарызавалі канцэрт пад рубрыкай «Музыка падсвядомасці». У яго праграме — музыка авангарда. У канцэрце прынялі ўдзел ансамбль «Класіка-авангард», вакальная група «Камерата», паэт з Швецыі Эркі Лапалайнен.

НА ЗДЫМКУ: на сцэне Белдзяржфілармоніі выступае сімфанічны аркестр БССР пад кіраўніцтвам народнага артыста БССР Юрыя Яфімава.

Фота У. ШУБЫ.

ПАД ЗНАКАМ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

«Людем посполитым к доброму научению» адрасавалася асветніцкая дзейнасць Францыска Скарыны, 500-гадовы юбілей якога стаў своеасаблівым сімвалам пачатку духоўнага адраджэння беларускага народа. Не выпадкова таму аднымі з першых уключыліся ў юбілейныя мерапрыемствы педагогі рэспублікі. 4 красавіка ў Мінску адкрылася рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Францыск Скарына і яго эпоха ў гісторыі асветы і педагагічнай думкі Беларусі». Самыя розныя аспекты творчай спадчыны вялікага асветніка закраналі ў сваіх выступленнях вучоныя метадысты і настаўнікі-практыкі, якія з'ехаліся на гэты навуковы форум з усёй Беларусі. Абмеркавана і канкрэтная методыка выкарыстання яго спадчыны ў агульным працэсе гуманізацыі нацыянальнай школы.

Канферэнцыю арганізаваў Інстытут педагогікі Міністэрства народнай адукацыі БССР і Педагагічнае таварыства БССР.

— Спадчына Скарыны — з'ява універсальная і таму мае прамыя адносіны да ўсіх праяўленняў творчага духу нацыі, — гаворыць старшыня аргкамітэта канферэнцыі акадэмік АПН СССР Міхаіл Лазарук. — Мы, педагогі, лічым сваім абавязкам прыняць самы актыўны ўдзел у рэалізацыі агульнай задумы па святкаванню 500-гадовага юбілею Францыска Скарыны — аднаго з тытанаў еўрапейскага адраджэння. Тым больш, што асветніцка-педагагічная дзейнасць займае ў яго спадчыне вядучае месца. Галоўная справа яго жыцця — пераклад на беларускую мову Бібліі — мае перш за ўсё асветніцкую накіраванасць. Многія кнігі свае Скарына выдаваў як дапаможнікі для спасціжэння мудрасці, свецкай і рэлігійнай, некаторыя, у прыватнасці «Псалтыр», — як падручнікі.

Творчая спадчына вучонага аказалася сугучнай галоўнаму напрамку перабудовы, у тым ліку ідэі гуманізацыі школы. У гэтых умовах асэнсаванне творчасці Скарыны дазваляе пераглядзець і некаторыя нашы канцэпцыі ў галіне адукацыі. У прыватнасці, прызнанне намі прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей дае падставу пановаму падыходзіць да гісторыі старажытнай літаратуры і да спадчыны самога Скарыны. Мэтай выхавання асветнік лічыў усялякае заахвочванне чалавекалюбства. У прадмове да «Псалтыра» ён пісаў, што чытанне гэтай кнігі «гнев и ярость усмиряют, мир и покой чинят, людей в приязнь зводят, ласку и милость укрепляют». У наш час, калі кожны дзень прыносіць новыя факты абвастрэння міжнацыянальных адносін і нейкага ўсеагульнага бытавога азлаблення, зварот да спадчыны Скарыны будзе мець самыя дабратворныя вынікі. Кнігі Скарыны — духоўны запавет будучым пакаленням. І мы, нашчадкі, павінны зрабіць усё, каб яго спадчына стала здабыткам усяго народа.

Н. ШЭЛДЫШАВА.

НАК У БЕЛАРУСІ?..

А чаму б і не! Нацыянальныя Алімпійскія камітэты ўжо створаны ў многіх саюзных рэспубліках СССР. Галоўнай сваёй мэтай яны ставяць прапаганду фізічнага ўдасканальвання людзей, барацьбу за чысціню спартыўных ідэалаў, усямернае расшырэнне міжнародных кантактаў. Тыя пазітыўныя перамены, што адбываюцца цяпер у многіх краінах свету, не маглі не закрануць перабудову алімпійскага руху як у Савецкім Саюзе, так і непасрэдна ў Беларусі.

Такім чынам, Алімпійскія камітэты створаны ў многіх рэспубліках СССР. Шлях, як кажуць, пракладзены. Значыць, Беларусі будзе лёгка цяпер ісці па ім?

— Не зусім, — адказвае спартыўным журналістам першы намеснік старшыні Дзяржкамспорту БССР Аляксандр Хандогін. — Бо мы не хочам капіраваць Алімпійскія камітэты іншых рэспублік. Тым больш, што некаторыя з іх супярэчаць нашым, савецкім ідэалам. Узяць, напрыклад, Прыбалтыку. Іх камітэты вядуць барацьбу за абсалютна самастойнае прадстаўніцтва ў міжнародным алімпійскім руху. На практыцы гэта азначае, што Літва, Латвія, Эстонія імкнуцца да поўнага аддзялення.

Наша ж пазіцыя пры арганізацыі НАК Беларусі адназначная: спартсмены рэспублікі павінны выступаць за зборную краіны на Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах свету і Еўропы.

Хаця мы разумеем тым не менш заклапочанасць грамадскасці рэспублікі, якая імкнецца да суверэнітэту, карыстаецца сталым аўтарытэтам на міжнароднай арэне, мае цудоўныя спартыўныя традыцыі. А таму лічым, што ўжо цяпер каманда БССР мае ўсё падставы ўдзельнічаць асобна ў міжнародных спаборніцтвах, апрача вышэйназваных. А далей, як гаворыцца, пакажа час.

Якімі бачацца асноўныя напрамкі дзейнасці Алімпійскага камітэта Беларусі?

Маючая адбыцца ўстаноўчая канферэнцыя сфармулюе іх дастаткова дакладна. Цяпер рыхтуюцца вызначальныя дакументы, у тым ліку альтэрнатыўныя праекты статута. У выпрацоўцы іх прымаюць удзел вядомыя і паважаныя ў свеце спорту людзі: А. Бялова, А. Мядзведзь, член НАК СССР прафесар Р. Жбанкоў, прадстаўнікі абласных і рэспубліканскіх спорткамітэтаў і іншыя. Але ў вызначэнні галоўных мэт і задач Алімпійскага камітэта ў асноўным разыходжанняў няма.

Гэта, у прыватнасці, умацаванне адзінства алімпійскага руху, садзеянне развіццю масавага спорту ў рэспубліцы, яго папулярызацыі, стварэнне і падтрымка розных фондаў і дабрачынных арганізацый, ахова інтарэсаў спартсменаў, трэнераў, ветэранаў фізічнай культуры, расшырэнне міжнародных сувязей і гэтак далей. Апрача гэтага, камітэт павінен аб'яднаць і актывізаваць дзейнасць усіх федэрацый па відах спорту і іншых спартыўных арганізацый рэспублікі.

Алімпійскаму камітэту такія задачы пад сілу: той аўтарытэт, якім здаўна заслужана карыстаецца фізкультурна-спартыўны рух Беларусі, дапаможа іх паспяхова вырашыць.





У мінскім Палацы тэніса завяршылася першынство Савецкага Саюза сярод дзяўчат. Каля ста юных тэнісістак з многіх гарадоў краіны змагаліся за прызы гэтых спаборніцтваў. Поспех спадарожнічаў мінскім спартсменкам. Сярод дзяўчат 1974 года нараджэння перамогу ў асабістых спаборніцтвах атрымала Таццяна Ігнацьева, а сярод 1976-га—Ганна Смашнова.

Усе пераможцы—выхаванкі аўтазаводскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы алімпійскага рэзерву па тэнісу.

НА ЗДЫМКАХ: у час спаборніцтваў; пераможца сярод дзяўчат старэйшага ўзросту мінчанка Таццяна ІГНАЦЬЕВА.

Фота Г. СЯМЁНАВА.

ЧЭМПІЯНАТЫ, ТУРНІРЫ, СУСТРЭЧЫ

ШАХМАТЫ. У Еўпаторыі завяршыліся адборачныя спаборніцтвы да чэмпіянату свету сярод дзяўчат. Першае месца тут заняла мінчанка Юлія Левітан. І цяпер яна вырашае задачу: гуляць у чэмпіянаце свету сярод старэйшых дзяўчат у Чылі ці выступіць у турніры малодшых у Сінгапуры.

ФУТБОЛ. Зборная СССР прымала ў таварыскім матчы каманду Галандыі і перамагла з лікам 2:1. Гэта была першая міжнародная сустрэча нашых футбалістаў перад чэмпіянатам свету ў сёлетнім сезоне. У гульні з галандцамі прымалі ўдзел мінчане Сяргей Алейнікаў і Андрэй Зыгмантовіч.

САМБА. Каля двухсот спартсменак з 13 краін прымалі ўдзел у міжнародным турніры памяці А. Харлампіева. Беларуская самбістка Ірына Емяльянава стала пераможцай у вагавой катэгорыі звыш 80 кілаграмаў.

Ірына, а таксама яе сяброўка па зборнай рэспублікі Таццяна Масквіна цяпер рыхтуюцца да першынства Еўропы, што пройдзе ў маі ў ФРГ.

ТЭНІС. За апошнія паўмесяца Наталля Зверава гуляла ў некалькіх міжнародных турнірах. Найбольшага поспеху беларуская тэнісістка дамаглася ў амерыканскім горадзе Хілтан Хэд Айлендзе, дзе ў пары з іспанкай М. Пас заняла другое месца.

ГАНДБОЛ. Пасля жараб'ёўкі ў штаб-кватэры ІГФ у Базелі стаў вядомы сапернік мінскага СКА ў паўфінале розыгрышу Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў — заходнегерманскі клуб ТУСЕМ. Гульні адбудуцца ў канцы красавіка.

ШАШКІ. Тры дні ў Мінску праходзіў таварыскі матч сталетачнікаў Беларусі і Галандыі. З лікам 39 : 27 перамаглі шашысты нашай рэспублікі.

ГІМНАСТЫКА. Мінчанка Святлана Багінская і масквіч Валянцін Магільны сталі лепшымі на IV міжнародным турніры ў Парыжы.

«СНЕЖНЫЯ БАРСЫ» ПАКАРАЮЦЬ ЭВЕРЭСТ

НЯМА ВЫШЭЙШАЙ ВЯРШЫНІ

Падзея неардынарная: другая савецкая экспедыцыя ў гэтыя дні пачала ўзыходжанне на самую высокую вяршыню свету Джамалунгму (Эверэст). Разам з нашымі альпіністамі ў акцыі, якая называецца «Узыходжанне свету» і праводзіцца ў праграме Гульняў добрай волі, прымаюць удзел амерыканскія і кітайскія спартсмены.

Падняцца на Джамалунгму — мара кожнага альпініста. Але толькі нямногім удалося пакарыць яе. Нават вопытным спартсменам не хапала сіл, часам — мужнасці і выслівасці, каб зрабіць узыходжанне на гару.

Вось чаму так скрупулёзна адбіраліся кандыдаты ў каманду СССР. Прыемна адзначыць, што сярод пакарыцеляў завоблачных вяршынь аказаўся і мінчанін Эдуард Ліпень.

Альпініст добра вядомы далёка за межамі рэспублікі. Да гэтага ён зрабіў узыходжанне на ўсе самыя высокія вяршыні СССР: пік Леніна, пік Камунізму,.. якія адносяцца да «сямітысячнікаў». Менавіта за пакарэнне іх адважнаму спарстмену было прысвоена званне «снежны барс».

Э. Ліпень працуе асістэнтам на кафедры дзіцячай хірургіі Мінскага медыцынскага інстытута. Узначальвае Федэрацыю альпінізму БССР.

Перад ад'ездам у Маскву пасланцу нашай рэспублікі была ўручана шкатулка з зямлёю, узятай з Кургана Славы пад Мінскам. Яна будзе ўстаноўлена на Джамалунгме. Святыню спартсмен атрымаў з рук Героя Савецкага Саюза Паўла Маладых. Ён вызначыўся ў баях пры вызваленні Беларусі. Уручаючы штакулку Эдуарду Ліпеню, Павел Пятровіч сказаў:

— Няхай гэта зямля, якая шчодра паліта крывёю нашых воінаў-вызваліцеляў, стане яшчэ адным помнікам савецкаму народу, сімвалам Вялікай Перамогі яго над фашызмам.

Нялёгкі шлях чакае альпіністаў. З Масквы яны вылецелі самалётам у Пекін, пасля поезд даставіў іх у цібецкі горад Лхаса.

Узыходжанне мужныя спартсмены вырашылі зрабіць з паўночнага боку гіганцкай вяршыні — самай складанай, цяжкай і небяспечнай. Завершыцца штурм піка да чэрвеня.

Атрыманы першыя звесткі ад беларускага альпініста з Лхасы. У прысланай ім тэлеграме кароткая інфармацыя: «Знаходзімся на вышыні 3 700 метраў над узроўнем мора. Пагрузілі на сем машын 25 тон экспедыцыйнага грузу. Як самы дарагі з іх — шкатулка са свяшчэннай зямлёй з Кургана Славы. Аўтамабільны караван працягвае рухацца да Джамалунгмы».

Мяркуем, што адважныя альпіністы паспяхова завершаць штурм вяршыні. І нам удасца сустрэцца з Э. Ліпенем і больш падрабязна расказаць у газеце аб гэтым нялёгкім узыходжанні. Пажадаем удачы мужным спартсменам.

П. УЛАДЗІМІРАЎ.

«ЗОРКІ» АДПРАЎЛЯЮЦЦА ЗА МЯЖУ

Летась пачалася сапраўдная міграцыя савецкіх спартсменаў за мяжу. Ужо адзін пералік іх прозвішчаў пацвярджае той факт, што ў «профі» адправіліся «зоркі» сусветнай велічыні: хакеісты Вячаслаў Фяцісаў, Сяргей Макараў, Уладзімір Крутаў, футбалісты Алег Блахін, Хангіз Хідзіятулін. Пералік можна працягваць...

Міграцыйны бум закрануў і спартыўную арганізацыю нашай рэспублікі. За мяжу паехалі Сяргей Алейнікаў, Сяргей Гоцманаў, Віктар Сокал, Сяргей Тукмачоў...

Вядома, калі браць матэрыяльны бок, то тут выгада немалая. Спартсмены займелі вялікія грошы, значныя сумы атрымалі Дзяржкамспорт СССР і камітэты саюзных рэспублік, клубы, за якія раней выступалі «зоркі».

Але ж ёсць і іншы бок гэтай справы. І ён не можа не хваляваць у першую чаргу балельшчыкаў. Сёння ж стала добра вядома: шчодрае раздорванне «зорак» прывяло да ўпадку некалі вядомых клубаў, а часам і відаў спорту. Далёка хадзіць за прыкладам не трэба: няўдала выступілі ў розыгрышы еўрапейскіх кубкаў па футболу маскоўскі «Спартак», кіеўскае «Дынама», страціў чэмпіёнскі тытул ЦСКА.

Асабліва востра адбіўся ад'езд за мяжу вопытных спартсменаў на выніках выступлення ў першынстве краіны мінскага «Дынама». Цяпер каманда перажывае крызіс. Няма каму замяніць тых жа Алейнікава, Гоцманава... Мінчане страчваюць ачкі, знаходзяцца ў канцы турнірнай табліцы. А, галоўнае, страчваюць балельшчыкаў. Гульні праводзяцца пры паўпустых трыбунах.

На днях пачынаецца першынство свету па хакею, не за гарамі чэмпіянат свету па футболу. І савецкія аматары жывуць пакуль у трывозе: а ці адпусцяць замежныя клубы ў зборныя СССР «зорак»? А калі і адпусцяць, то ці будзе паміж імі і тымі, хто трэніруецца зараз дома, сыгранасць? Трывога мае падставы. Апошнія кантрольныя гульні зборных прынеслі мала аптымізму балельшчыкам. Хакеісты СССР у таварыскіх сустрэчах прайгралі па матчу камандам Швецыі і Фінляндыі. Непераканаўча выступілі і футбалісты са зборнай Галандыі. Так што аматарам спорту краіны мала пакуль радасці ад таго, што пераход «зорак» у прафесіянальныя клубы ідзе поўным ходам.

Е. ІВАНОЎ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
220600, МІНСК,
ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97,
33-02-80, 33-03-15,
33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Індэкс 63854. Зак. 503